# ГЕРОЛЬД LITHERLAND

**№ 2 (2). Горадня, 2001. Год I.**

**“Герольд Litherland”** – навуковы геральдычны часопіс. Выдавец і рэдактар – Аляксей Шаланда. Намеснік рэдактара – Сяргей Амелька. Нумар дапамагалі рабіць: Юры Кітурка, Іна Крайнева, Наталля Сліж. Часопіс выходзіць раз у квартал і распаўсюджваецца толькі па замове. Наклад 100 ас. Пры передруку спасылка на часопіс “Герольд Litherland” абавязковая. Адрас для допісаў і замоў: **Рэспубліка Беларусь, 230024, Горадня-24, п/с 50. E-mail: Litherland@tut.by**

**ЗМЕСТ:** В.Карпыза: **Род Біспінгаў на Ваўкавышчыне ў XVIII–XX ст.**, с.49; А.Шаланда: **Зямельныя гербы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIV–XVIII ст.**, с.52; Н.Сліж: **Крыніцы па гісторыі шляхецкай сям’і XVI–XVII ст.**, с.67; А.Шаланда: **Матэрыялы па генеалогіі роду Міцкевічаў у XVII–XIX ст.**, с.73; А.Шаланда, І.Крайнева: **Кавалак “Дыярыушу” XVII ст. Грыгора Мірскага, стражніка Вялікага княства Літоўскага**, с.75; С.Амелька: **Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня (працяг)**, с.79; **Рэцэнзіі**, с.80; **Пытанні, адказы, кантакты, інфармацыя**, с.82; **Спіс скаротаў**, с.84.

## ***ДАСЛЕДАВАННІ***

# Род Біспінгаў на Ваўкавышчыне ў XVIII–XX ст.

In the article *“Clan of Bispings in Vaukavysk region in the 18th –20th c.”* **Vitold Karpyza** considers the history and genealogical tree of this German family in Belarus. Bispings had property in Vaukavysk region such as Viareia, Konna, Strubnica, Manciaki. The article is based on literature, memoirs and correspondence and retraces life every person from the Bispings beginning from 18 c. and finishing present day.

На тэрыторыі былога Ваўкавыскага павету, насупраць Струбніцы, род Біспінгаў пасяліўся ў канцы XVIII ст. У тыя часы Ян Тадэвуш Біспінг быў уладальнікам Струбніцы. Біспінгам належалі тады ў Ваўкавыскім павеце наступныя маёнткі: Вярэя, Конна, Вішнёўка, Янаўшчызна, Сядзельнікі, Манцякі, Струбніца, Галоўчыцы і Кузмічы.

Паводле *“Гербоўніка”* Адама Банецкага, Біспінгі дадавалі да прозвішча прыдомак *“von Gallen”*. Іншы аўтар дадае, што род гэты нямецкага паходжання, трыста гадоў таму назад у Літве аселы, заўсёды шчыра і ганарова служыў [1]. У Вестфаліі было іх родавае гняздо. Аднак, у выніку пераследу пратэстантаў, вымушаны былі Біспінгі пакінуць радзіму. Ёсць звесткі, што ўжо ў 1583 г., а значыць за Стэфана Баторыя, яны былі ў Рэчы Паспалітай. Т.Жыхлінські сцвярджаў, што сынам **Яна** быў **Тамаш**, які ў 1635 г. ад Уладзіслава IV атрымаў наданні ў ваколіцах Старадубу[1], дзе Біспінгі некалькіх пакаленняў выконвалі функцыі: кашталянаў, маршалкаў і суддзяў Старадубаўскіх [2]. *“У часы панавання караля Яна Казімера, Тамаш Біспінг, узначаліўшы абарону Старадубаўскага замку, загінуў на яго руінах, у выломе, праз які казакі, топчучы яго астанкі, уварваліся ў замак. Пасля яго смерці, кароль Ян Казімер не забыў аб яго сынах.*

---

[1] Старадуб – павятовы горад Смаленскага ваяводства Рэчы Паспалітай.

*Выдаў ён прывілей ад 13 мая 1665 г., якім падцвярджаў Біспінгам наданне Уладзіславам IV значных маёнткаў у Смаленскім ваяводстве”* [3, s.26].

Некаторыя *“Гербоўнікі”* згадваюць яшчэ: **Самуэля** Біспінга, скарбніка Старадубаўскага, які падпісаў элекцыю Яна III, **Тэафіла**, мечніка Старадубаўскага, пасла і дэпутата той жа зямлі, які ўдзельнічаў у выбарах караля Аўгуста II, **Тэафіла**, суддзю Рэчыцкага, **Уладзіслава**, суддзю і **Тамаша**, стражніка Старадубаўскіх, якія падпісаліся са Смаленскім і Мінскім ваяводствамі пад элекцыяй таго ж Аўгуста II. Негледзячы на тое, што на падставе міру Грымултоўскага ад 6 мая 1686 г. Старадуб перайшоў ва ўладанне Расіі, шляхта, якая там жыла, захавала ўсе тытулы Старадубаўскія. За заслугі атрымала яна ў ВКЛ новыя маёнткі, аднак, працягвала далей абіраць сваіх маршалкаў і ўраднікаў Старадубаўскіх. Старадубаўскія земскія суды перанеслі ў Вільню.

Наталля з Біспінгаў Кіцкая, жыццё якой ахапіла амаль цэлае XIX ст., пісала аб бацьках свайго прадзеда **Баляслава** Біспінга – **Зыгмунце** і яго жонцы Кацярыне. Памяць аб іх захавалася толькі дзякуючы партрэтам, што віселі ў доме Біспінгаў. Сын Зыгмунта і Кацярыны Лазоўны Баляслаў, маршалак Старадубаўскі, ужо на стала асеў у Ваўкавыскім павеце, а галоўнай яго сядзібай былі Галоўчыцы [4]. “*З рамаў першага партрэту*, – піша Н.Кіцкая, – *выглядала выява Баляслава Біспінга з аголенай як калена галавой з пышнымі вусамі. Выраз яго суровага твару пасаваў да выгляду адзення. Насіў кунтуш і жупан, трымаў маршалкоўскую ляску ў адной руцэ.*[2] *Жонку сваю Разалію з дому Адамовічаў любіў шалёна, бо была з выгляду і настрою не вельмі падобная на мужа – элегантная зграбнуся. Паводле партрэту, што знаходзіцца ў Галоўчыцах, яна ўсміхаецца, мае завітыя валасы і напудрана як дама, належачая да двара французскіх каралёў. Мела валасы заколатыя ружачкай, абшыты карункамі раброн, а плашч аксамітны, падбіты гарнастаямі, збягаў з яе плеч*” [3].

З чатырох дзяцей Баляслава, ганаровае месца займаў **Ян Тадэвуш** Біспінг, каштэлян Старадубаўскі. Доўгае жыццё, а жыў 81 год (1741–1822), дазволіла яму шырока дзейнічаць. Удзельнічаў, яшчэ як харунжы Старадубаўскі, у элекцыі караля Станіслава Аўгуста [5]. Пазней быў па чарзе: гараднічым, пісарам земскім, маршалкам і каштэлянам Старадубаўскім. На два гады перажыў сваю жонку Ганну з Мікульскіх, справіўшы ёй пышнае пахаванне ў Струбніцы [6]. “*У час кандукту*, – піша тагачасны *“Кур’ер Літоўскі”, – якому асыставала фамілія і сто капланаў з запаленымі свечкамі, прамаўляў цэлеброваў кс.Стургалеўскі і Стэфан Мікульскі, капітан польскіх войскаў, суддзя гранічны слонімскі, родны сыновец Я[сна]В[яльможнай] маршалковай*”.

Меў яшчэ Ян братоў: **Юзафа** ўладальніка Вярэек і **Міхала**, які памёр маладым у 1769 г., а таксама сястру **Брыгіду** замужам за Бенядыктам Бухавецкім, падкаморым Берасцейскім.

Ян Біспінг быў найбагацейшым са шляхты ў Ваўкавыскім павеце. Яму належалі: Азярніца, Конна, Вішнёўка, Янаўшчызна, Сядзельнікі, Манцякі, Струбніца і Галоўчыцы. Дазваляла гэта весці жыццё магната і бавіць час у каштоўных паляваннях. Маёнткі пускаліся ў заставу, а калі не хапала грошай, каб іх выкупіць, яны паступова выпадалі з рук Біспінгаў. Існавала нават такое выслоўе:

*“Прайграў ты Азярніцу,*
*Пратрубіш і Струбніцу”.*
Або: “*Bispinga psy zjadły*”.

Ян Біспінг на 36 гадоў перажыў свайго малодшага брата, які валодаў Вярэйкамі, і прыняў апеку над яго дзецьмі – **Аляксандрай** і **Юзэфай**. Сам быў пахаваны каля жонкі ў Струбніцы. Да сёння захаваўся яго помнік перад Струбніцкім касцёлам. Надпіс, выбіты

---

[2] Сёння копію гэтага партрэта можна пабачыць на пахавальнай пліце работы майстра Юзафа Прукнера (1789 г.) у Ружанскім касцёле Святой Троіцы. З надпісу, які там змешчаны, вынікае, што Баляслаў Біспінг, маршалак Старадубаўскага павету, кавалер ордэну Святога Станіслава, памёр у 1787 г. (Гл.: Пластыка Беларусі XII–XVIII ст.– Мн.: Беларусь, 1983.– фота № 166).– *Рэд.*

на камяні, ужо слаба чытэльны, канчаецца словамі: “*Nagrobek wystawiony Rodzicom przez wdzięczne dzieci, którzy przechodniów proszą o troje pozdrowienia Anielskie*”.[3]

Згаданы вышэй брат Яна, Юзаф, жанаты на Тэадоры з Сухадольскіх, жыў у Вярэйках у тым жа Ваўкавыскім павеце. 24 ліпеня 1784 г. у іх нарадзілася дачка **Юзэфа**, а два гады пазней – **Аляксандра**, фундатарка касцёла ў Вярэйках. Гэтыя две сястры выхоўваліся пад апекай маці, бо стольнік Юзаф Біспінг хутка памёр. Апекунам асерацелай сям’і застаўся брат стольніка Ян, маршалак Старадубаўскі, які за пакінутыя братам грошы купіў Масаляны. Але “*zawsze rozsądna i wielce szanowana*” стальніковая ўмела ўпраўляцца сама. Дочкі вучыліся і раслі, а маці заўзята іграла ў карты. Сустрэўся ёй нейкі Толь (Анатоль) Свечын, палкоўнік, праваслаўны, з добрага баярскага роду, які абыграў стальніковую на 30000 рублёй і гэта аблегчыла яму знаёмства з Біспінжанкамі. У 1806 г. Аляксандра выйшла замуж за Свечына. Па просьбе сваёй жонкі апошні атрымаў ад Расійскага імператара дазвол на пабудову касцёла ў Вярэйках. Памёр Свечын у 1838 г. і быў пахаваны ў Кузміцкай царкве, а яго помнік існуе і сёння пры дарозе насупраць касцёла.

Гербы Тэадоры Сухадольскай Біспінговай і Юзафа Біспінга



Сястра Свечынавай Юзэфа выйшла замуж за Антонія Вайчынскага і атрымала ў пасаг Масаляны. З мужам пражыла 16 гадоў, а пазней развялася, пры гэтым Вайчынскі ажаніўся з яе пакаёўкай Рудавіцкай. Аляксандра Свечынавая, адчуваючы блізкую смерць, разам з Вайчынскай, будучы бяздзетнымі, фундавалі на сваіх маёнтках Масалянскую ардынацыю. У сувязі з гэтым, Масаляны перайшлі ва ўласнасць уладальнікаў Струбніцы.

Найстаршым з сыноў Яна Біспінга і Ганны Мікульскай быў **Пётр**. Ён, жанаты на Юзэфе Кіцкай, тройчы быў маршалкам Ваўкавыскага павету. Яго дачка **Наталля** нарадзілася ў Галоўчыцах і была аўтаркай вышэй цытаваных успамінаў [3, s.30]. Яна выйшла замуж за свайго кузына – генерала Кіцкага, які загінуў пад Астраленкай. Наталля была адной з найпрыгажэйшых жанчын. Яе сучаснік польскі паэт Зыгмунт Красіньскі пісаў свайму сябру: “*Twoja siostra, o której wieść głosi, że jest najpiękniejszą kobietą na Litwie i Koronie*” [7].

Складаны герб “крэўнасці” Пятра Біспінга, які ўключае яго ўласны герб і “Газдаву” жонкі Юзэфы з графоў Кіцкіх



На 14 гадоў перажыў Пятра яго брат **Адам** (1784–1858). Браты падзялілі паміж сабой спадчынныя маёнткі: Пётр атрымаў Галоўчыцы і Конна, а Адам – Струбніцу, Янаўшчызну і Азярніцу. У 1812 г., ахвяраваўшы пэўныя сродкі на фарміраванне ў Літве 22 палку літоўскай пяхоты, Адам быў прызначаны яго палкоўнікам.

Адзіным сынам Адама быў **Каміл** (1810–1850). Да канца свайго жыцця ён жыў у Струбніцы, палюючы і вядучы жыццё заможнага магната. Шмат каштаваў яму рамонт Струбніцкага касцёла, у сувязі з чым, Каміл, каб пакрыць кошты, прадаў Азярніцу.

Не мінулі Біспінгаў і сямейныя трагедыі. Адной з іх была смерць прафесара Віленскага універсітэта Юрэвіча, які загінуў з-за кахання да Наталлі Кіцкай. Другая была звязаная з **Аляксандрам** Біспінгам, сынам Каміла, першым ардынатам Масалянскім.

“*Згаданы Біспінг*, – сведчыць ксёндз Альбін Горба, былы пробашч з Вярэек, – *закахаўся ў дачку Гарадзенскага губернатара. Паехаў да яе з прызнаннем у каханні і*

---

[3] Поўны тэкст, трошкі адменны, аўтар падаў у іншай сваёй публікацыі: *“Dom wiecznego spoczynku Pana Jana Bispinga Marszałka Starodubowskiego i Kawalera Orderu św.Stanisława I klasy, zmarłego 1822 Septembra 18 dnia oraz Anny z Mikulskich Bispingowej, żony jego, zeszłej roku 1820 Stycznia dnia 25. Wzstawiony dla najdroższych rodziców przez synów, którzy przechodnia proszą o troje Anielskiego Pozdrowienia”.* Тамжа былі змешчаны і аўтарскія малюнкі гербаў, якія падаюцца ў гэтым тэксце (Гл.: Karpyza W. Kościół w Strubnicy.// Goniec Kresowy.– Nr 2 (22).– 1995.– S.6.).

*прапановай шлюбу. Дачка губернатара, выхаваная ў духу расійска-праваслаўным, адказала, што замуж за католіка не выйдзе. У роспачы Аляксандр вярнуўся ў Масаляны, потым зноў паехаў у Горадню, засведчыў архірэю сваё жаданне прыняць праваслаўе і даў дакумент, што ён гатовы касцёл у Вярэйках і капліцу ў Масалянах перарабіць у цэрквы. Панна, аднак, усё роўна адмовіла і Біспінг закончыў жыццё самагубствам*" [8].

Трэцяя сямейная трагедыя была звязана з асобай **Яна** Біспінга сына **Юзафа**, чацьвёртага Масалянскага ардыната, які нарадзіўся ў 1880 г. Быў ён абвінавачаны ў забойстве ў 1913 г. князя Уладзіслава Друцкага-Любецкага. Пасля доўгага судовага працэсу ў 1928 г. Ян быў цалкам апраўданы [9].

З паміжваеннага часу трэба ўзгадаць **Казімера** Біспінга са Струбніцы [10], які ў Польшчы быў сенатарам (1934–1939). Адзін з яго сыноў **Юзаф** сёння жыве ў Канадзе. Жонкай Юзафа з'яўляецца Габрыэля Валавічоўна, апошняя са славутага роду Валовічаў. Жывуць таксама нашчадкі Біспінгаў і ў Польшчы [11].

*Вітольд Карпыза*
*(пераклад з польскай)*

**Літаратура і крыніцы:**


1. "Moje wspomnienia w Massalanach spisane". Pamiętniki Jana Ordynata Bispinga, 1842–1892.– Maszynopis w Ossolineum we Wrocławiu.– Sygn.13132.II.
2. Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej: W 31 t.– Poznań, 1879–1903.
3. Kicka N. Pamiętniki.
4. Słownik geograficzny królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich./ Pod red. B.Chlebowskiego.– Warszawa, 1889.
5. Boniecki A. Herbarz Polski: W 16 t.– Warszawa, 1899–1913.
6. Kurier Litewski.– 1820.– Nr 41.
7. Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie.
8. List ks.A.Horby (у архіве аўтара).
9. Szenic S. Pitival Warszawski.– T.II.
10. Jasiewicz K. Lista strat ziemiaństwa polskiego (1939–1956).– Warszawa, 1995.
11. Bisping A. Nasze Massalany. Wspomnienia.


## Зямельныя гербы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIV–XVIII ст.


In the *article "Land Arms Grand Duchy of Lithuania, Russia and Samogitia in the 14th –18th c."* **Alaxiej Szałanda** considers unknowing problem of Belarussian heraldry. The author tries to prove that before the unification of land arms of GDL in 1566 when "Pagonia" was brought into use for all provinces and regions there were original land arms which were on the Great Seal of GDL. According to the proposed interpretation the arms "Cross" was in Vołyń province, "The Knight with halberd" – in Troki province, "Gonfalon" – in Smalensk province, "Deer" – in Połack province, "Spas" – in Viciebsk province, "Archangel" – in Kieu province, "Two persons" – in Padlaszsza (Podlachia) province, "Pagonia" in Vilnia province and "Raising bear" – in Żamojć (Samogitia) province. The proposed version of the Great Blason of Belarus is based on these conclusions.


Сярод самых занядбаных праблем геральдыкі Беларусі да сённяшняга дня з'яўляюцца зямельныя гербы ВКЛ. У айчыннай гістарыяграфіі ўсталявалася думка, што ўсе беларускія землі ў складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай мелі за герб "Пагоню" з пэўнымі адрозненнямі [1, с.144; 2, с.63]. Аднак, гэтая выснова была зроблена без глыбокага даследавання шматлікіх крыніц, якія захаваліся да нашага часу: заходнееўрапейскіх і польскіх гербоўнікаў XIV–XVI ст., геральдычных і сфрагістычных помнікаў XV–XVIII ст., у першую чаргу пячатак вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх. Ужо першае знаёмства з імі дазваляе гаварыць аб тым, што зямельная геральдыка ВКЛ значна багацейшая, а таму даўно настаў час вярнуць яе з забыцця.

Знаёмства з геральдыкай і сфрагістыкай сваіх заходніх суседзяў – Тэўтонскага Ордэну, Лівоніі, Польшчы, Мазовіі, Венгрыі, спрыяла складванню ў другой палове XIII–XIV ст. у ВКЛ уласных геральдычных эмблем заходнееўрапейскага ўзору. Галоўная заслуга ў гэтым належала князю Вітаўту Кейстутавічу (1382–1430). Менавіта з ім звязана з'ўленне першых зямельных гербаў у ВКЛ. Атрымаўшы рыцарскае выхаванне, доўгі час

знаходзячыся сярод рыцарства Тэўтонскага Ордэну, Вітаўт у пачатку XV ст. уводзіць пасаду герольда ў ВКЛ. У гэты ж самы час з'яўляюцца яго гербавыя пячаткі з зямельнымі гербамі. Палітычныя амбіцыі і цэнтралізатарская палітыка Вітаўта замацоўваліся геральдычнымі сродкамі, на заходні ўзор, паводле якога, каралеўства павінна было складацца найменш з чатырох прылеглых герцагстваў (княстваў), у сваю чаргу, герцагства складалася не менш як з чатырох графстваў [3, с.98–99]. У геральдыцы гэтае правіла прадвызначыла падзел тарчы на чатыры поля.

Улічваючы жаданне Вітаўта дабіцца для сябе каралеўскай кароны, можна меркаваць, што менавіта вышэй згаданае правіла ляжала ў аснове з'яўлення ў яго на пячацы чатырохчастковага гербу. Адбылося гэта якраз пасля таго, як ён у 1401 г. атрымаў уладу вялікага князя літоўскага, якую меў да канца свайго жыцця ў 1430 г. [4, s.717]. На пячатцы Вітаўта з дакумента 1404 г. тарча падзеляна на чатыры часткі: у 1 полі – геральдычны крыж, у 2 – вершнік з мячом, у 3 – рыцар з дзідай і ў 4 – ідучы мядзведзь [4, s.720, tabl.6, № 42]. Паводле польскага даследчыка Мар'яна Гумоўскага, гэта былі гербы Валыні, Віленшчыны, Трокаў і Кіеўшчыны адпаведна [4, s.720]. Гэтыя ж самыя гербы, толькі на асобных тарчах, былі змешчаны і на троннай пячатцы Вітаўта (1407–1430) [4, s.720–721, tabl.5, № 34]. Як слушна заўважыў той жа М.Гумоўскі, на апошняй пячатцы ўпершыню: *"...названы Вітаўт вялікім князем літоўскім і здаецца, што гэты тытул і пасада былі таксама непасрэднай прычынай вырабу такой пячаткі"* [4, s.721]. Анатоль Цітоў трошкі інакш тлумачыць гербы на згаданай пячатцы. Пагадзіўшыся з Валынскім і Троцкім, ён вершніка аднёс да агульнадзяржаўнага гербу "Пагоні", а мядзведзя – да Жмудзі (Жамойці) [5, с.17–18]. Апошні нават быў названы ім гербам-прэтэнзіяй, бо на час вырабу троннай пячаткі Вітаўта Жамойць знаходзілася пад юрысдыкцыяй Тэўтонскага Ордэну [5, с.19].

На нашу думку, з названых чатырох гербаў толькі рыцар з дзідай ***Троцкай зямлі*** ці ***княства*** не выклікае ніякіх пярэчанняў. Трокі яшчэ Гедымінам былі нададзены сыну Кейстуту (бацьку Вітаўта), які на сваіх пячатках выкарыстоўваў выяву рыцара з тарчай і мячом [4, s.702–703, tabl.4, № 29–30]. Няма сумневу, што менавіта гэтая выява ў трошкі змененым варыянце (замест мяча рыцар атрымаў дзіду) ператварылася ў Вітаўта ў Троцкі зямельны герб. Паводле гербоўніка з першай паловы XV ст. *"Codex Bergshammar"* ён выглядаў так: у чырвоным полі крочыць срэбраны рыцар, які правай рукой трымае дзіду, а левай абапіраецца на тарчу, дзе ў чырвоным полі змешчаны залатыя калюмны [6, s.81, rус.13/1]. Амаль такую ж гербавую выяву Троцкай зямлі (толькі без "Калюмнаў") падае яшчэ адзін гербоўнік з сярэдзіны XV ст. – *"Stemmata Polonica"* [7, s.149–150].

Герб Троцкай зямлі ці княства паводле *"Stemmata Polonica"* [7, s.150, fot.5].



Што датычыць гербу з геральдычным крыжам, то ён з'явіўся ў Вітаўта ў выніку пераймання з заходняй, а менавіта з крыжацкай, геральдыкі. У Заходняй Еўропе выява такога крыжа была геральдычным эквівалентам Святога Юрыя. Сцяг з такім крыжам выкарыстоўваўся ў войску Вітаўта, а таксама на кап'і вершніка на адной з яго конных партрэтных пячатак [7, s.151; 8, с.241, мал.3]. Папулярнасць гэтай геральдычнай выявы ў Вітаўта адбілася на існаванні ў геральдыцы ВКЛ XV ст. некалькіх яе каляровых відаў. Срэбраны геральдычны крыж у чырвоным полі, які належаў ***Валынскай зямлі***, быў пададзены ў *"Codex Bergshammar"* [6, s.81, rус.12/9].

Герб Наваградскай зямлі ці княства паводле *"Stemmata Polonica"* [7, s.151, fot.6].



Другі каляровы варыянт: чырвоны крыж у срэбраным полі, быў змешчаны ў вядомым ужо нам гербоўніку *"Stemmata Polonica"*. Паводле польскага геральдыста Ежы Лойкі, гэты герб належаў да ***Наваградскай зямлі*** ці ***княства*** і менавіта

ён, а не валынскі, быў змешчаны на пячатках Вітаўта[4] [7, s.149]. Аднак, тытул Луцкага князя, якім карыстаўся Вітаўт, прымушае думаць аб прыналежнасці гербу з крыжам на яго пячатках да Валыні. Разам з тым, адзначым, што ў сярэдзіне XV ст. ужо існаваў герб Наваградскай зямлі, які адрозніваўся ад валынскага толькі колерамі поля і геральдычнай выявы. З’яўленне яго па часе стварэння *“Stemmata Polonica”* (сярэдзіна XV ст.) можна звязаць толькі з гербатворчай дзейнасцю вялікага князя літоўскага і караля польскага Казімера Ягайлавіча, пра што ніжэй яшчэ будзе гаворка.

Варта згадаць таксама герб смаленскага князя Фёдара Юр’евіча з *“Хроніке Канстанцкага сабора”* (першая палова XV ст.), які выглядаў так: тарча падзеляна на чатыры часткі, у 1-ай і 4-ай – у чырвоным полі паўтараецца срэбраны (па іншых звестках – залаты) крыж, а ў 2-ой і 3-яй – у блакітным полі паўтараецца палова залатога льва, чыю вантробу выядае арол [9, с.36–37, мал.31/е; 10, Nr.11, s.169–170]. Афіцыйна Фёдар названы там *“князем Белай Русі і гаспадаром Смаленска”* [11, с.52], што дае падставы лічыць апісаныя гербы ў 1-ай і 4-ай частцы гербам *“Белай Русі”*, а ў 2-ой і 3-яй – гербам *“Смаленска”*. Паводле Алеся Белага, назва *“Белая Русь”* у той час яшчэ не адносілася да сучасных беларускіх земель, а мела дачыненне да Наўгародскай Рэспублікі [11, с.53]. Для нас жа важна тое, што гербы з геральдычным крыжам на тарчы ў каляровых варыянтах адносіліся выключна да розных земель “Русі”.

Яшчэ адзін герб з *“Codex Bergshammar”*: у блакітным полі залаты крыж – пакуль нерасшыфраваны. Адам Гэймоўскі выказаў меркаванне, што гэта мог быць герб Жамойцкай ці Луцкай каталіцкай капітулы [6, s.83, rус.13/12]. На нашу думку, апошняе больш верагодна, улічваючы яго блізкасць з гербам Валыні.

У адносінах да гербу з вершнікам, які быў змешчаны на пячатках Вітаўта, важнай акалічнасцю з’яўляецца тое, што ён не мае абавязковай для дзяржаўнай “Пагоні” малой тарчы на плячы ў рыцара. У сувязі з гэтым, больш рацыі меў М.Гумоўскі, калі аднёс яго да Віленшчыны. Менавіта такім – без малой тарчы (толькі вершнік скіраваны ўлева) падае герб ***Віленскай зямлі*** ці ***княства*** гербоўнік *“Stemmata Polonica”* [5] [7, s.149–150]. Супраць меркавання А.Цітова аб ім як аб дзяржаўнай “Пагоні” сведчыць таксама тое, што чатырохчастковы герб на пячатцы Вітаўта з 1404 г., дзе быў такі ж самы вершнік, па сутнасці і з’яўляўся агульнадзяржаўным вялікім гербам, які злучаў у сабе чатыры галоўныя гербы зямель-княстваў, належачых вялікаму князю літоўскаму.

Герб Віленскай зямлі ці княства паводле *“Stemmata Polonica”* [7, s.150, fot.4].



Апошні герб з пячатак Вітаўта, які ўяўляе сабой ідучага на чатырох лапах мядзведзя, на нашу думку, не належаў Жамойці. Па-першае, таму, што Жамойць не ўваходзіла на час стварэння пячатак у склад ВКЛ. Па-другое, на вядомым жамойцкім гербе мядзведзь быў узняты (гл.ніжэй). Паводле Е.Лойкі, герб з *“Codex Bergshammar”*: у чырвоным полі срэбраны мядзведзь ідзе ў левы бок, належаў ***Смаленскай зямлі*** ці ***княству*** і менавіта ён быў на пячатках у Вітаўта [7, s.151]. Аднак, пасля паразы ад татар у 1399 г. Вітаўт часова страціў свой уплыў на Смаленск. У сувязі з гэтым, герб з выявай ідучага мядзведзя на яго пячатцы не мог належаць да Смаленскай зямлі. У той жа час, А.Гэймоўскі адносіў яго або да Кіеўскай зямлі, або да Жамойці, больш схіляючыся да першага варыянту [6, s.81]. На наш погляд, блытаніна ўзнікла з-за таго, што амаль

[4] Паводле Е.Лойкі, пячаткі Вітаўта мелі такія гербы: геральдычны крыж – Наваградская зямля, пешы рыцар з дзідай – Троцкая зямля, вершнік з мячом – Віленская зямля і ідучы мядзведзь – Смаленская зямля [7, s.149]. У адносінах да першага і апошняга гербаў, ён, аднак, памыляецца (гл. далей у тэксце).

[5] Праўда, *“Codex Bergshammar”* падае герб Віленшчыны з выявай класічнай “Пагоні” – у вершніка на плячы тарча з падвойным крыжам, але затое “Пагоня” вялікага князя літоўскага падаецца з “Калюмнамі” [6, s.81, rус.12/6].

адначасова існавала некалькі гербаў з выявай мядзведзя[6], якія адрозніваліся толькі колерамі поля і выявы. Можна пагадзіцца з М.Гумоўскім, што згаданы герб на пячатках Вітаўта, хутчэй за ўсё, адносіўся да ***Кіеўскай зямлі*** ці ***княства*** [4, s.720], але выглядаў ён, паводле *"Stemmata Polonica",* так: у блакітным полі чорны ідучы мядзведзь [6, s.81, заўвага 52; 7, s.151, fot.7]. Разам з тым, срэбраны мядзведзь у чырвоным полі сапраўды належаў Смаленскай зямлі, але гэта быў герб, створаны або ў канцы княжання Вітаўта, або ў часы кіравання вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча (1432–1440), калі Смаленск канчаткова ўвайшоў у склад ВКЛ. Улічваючы тое, што герб Смаленскай зямлі адрозніваўся ад гербу Кіеўшчыны толькі колерамі, можна меркаваць аб працы над ім менавіта герольдаў Вітаўта.

Такім чынам, у часы кіравання вялікага князя Вітаўта склаліся наступныя зямельныя гербы: Віленскі, Троцкі, Валынскі, Кіеўскі і Смаленскі. Варта адзначыць, што з'явіліся яны двума шляхамі: першы – гэта геральдызацыя напячаткавых дынастычных ці асабістых выяў-клейнаў вялікіх князёў літоўскіх – уладароў пэўных зямель (Віленскі, Троцкі гербы), другі і асноўны – гэта перайманне гатовых узораў, пераважна з заходнееўрапейскай геральдыкі (Валынскі, Кіеўскі і Смаленскі гербы). Важнай асаблівасцю зямельнай геральдыкі ВКЛ было тое, што гербы вышэй названых зямель з'явіліся раней ці амаль адначасова з гербамі літоўскага і беларускага рыцарства.[7] Звяртае на сябе ўвагу таксама прыярытэт чырвонага колеру і срэбра ў згаданых гербах ды і ўвогуле ў геральдыцы ВКЛ.

Вышэй апісаныя геральдычныя выявы былі зафіксаваны ў гербоўніках першай паловы–сярэдзіны XV ст., а таксама на пячатках Вітаўтавых наступнікаў – спачатку Свідрыгайлы Альгердавіча, а пасля – Жыгімонта Кейстутавіча. На тронных пячатках як першага, так і другога былі змешчаны тыя ж самыя гербы, што і ў Вітаўта [4, s.715–716, 724–725, tabl.7, № 48–49]. Улічваючы, што ў Жыгімонта Кейстутавіча тытул на пячатцы гучаў як: *"...Sigismundi dei gratia magni ducis Lithwaniae, Russie et"* [4, s.725], можна меркаваць аб прыналежнасці гербаў менавіта да зямель Літвы (Вільня, Трокі) і Русі (Валынь, Кіеў ці Смаленск). Калі аб нейкай гербатворчасці ў часы даволі кароткага і бурлівага панавання вялікага князя Свідрыгайлы гаварыць цяжка, то на часы кіравання брата Вітаўта Жыгімонта можна аднесці канчатковае кшталтаванне "Калюмнаў", гербу Віленскага і Троцкага ваяводстваў, Валынскай і Смаленскай зямель, якія зафіксаваны ў *"Codex Bergshammar"* [6, s.80–81].

Аб гербатворчасці ў ВКЛ у гады кіравання Казімера Ягайлавіча (1440–1492) дазваляе меркаваць наяўнасць пасады яго герольда [15, s.132]. Сапраўды, праца над стварэннем новых зямельных гербаў як у Польшчы, так і ў ВКЛ праводзілася, аб чым сведчаць наступныя гербы. Па-першае, гэта герб Наваградскай зямлі са *"Stemmata Polonica"*, пра які мы ўжо згадвалі вышэй. Па-другое, пры Казімеры быў створаны герб леннай Прусіі, які Ян Длугаш апісаў як герб *"Pomeranie, Culmensis et Michalouiensis terra"* [13, s.45, h.13]. Паводле гербоўніка Барташа Папроцкага (1584), Прускае княства ўжывала за герб: *"...чорнага арла, каля шыі якога выцягнута рука з мячом..."* [14, s.921]. Аляксандр Гваніні ў сваёй *"Хронiцы Сарматыі"* (1611) апісаў яго больш падрабязна: *"...арла чорнага, меч голы рукой людзкай трымаючага, праз шыю з залатой каронай, у залатым полі, за герб носяць..."* [16, ks.IV, cz.2, s.26] Спалучэнне чорнага прускага арла са збройнай рукой з мячом не было выпадковым – апошні элемент быў часткай дзяржаўнага гербу ВКЛ і самога Казімера. Гэта, а таксама карона на шыі арла, сведчыла аб падпарадкаваным становішчы Прускага княства. Новы герб Прусіі, які быў створаны

---

[6] Напрыклад, Холмская зямля, паводле апісання Яна Длугаша, мела за герб: *"...белага мядзведзя, які стаіць пасярод двух зялёных дрэў, у чырвоным полі..."* [12, с.89; 13, s.45, h.12]. Чорны мядзведзь быў і ў гербе горада Перамышля [14, s.914].

[7] У Польшчы быў адваротны працэс – рыцарскія гербы з'явіліся ў сярэдзіне XIII–сярэдзіне XIV ст., а зямельныя – толькі ў пачатку–другой палове XIV ст. [15, s.65].

пасля яе далучэння да Польшчы ў 1454 г. [17, s.399–400], увайшоў у лік зямельных гербаў Польшчы і замацаваўся на польскай троннай пячатцы Казімера Ягайлавіча [18, s.190–191, tabl.IV, rys.26]. Па-трэцяе, менавіта ў часы Казімера Ян Длугаш стварыў гербоўнік *"Insignia seu Clenodia Regni Poloniae"*, дзе ён падаў зямельныя гербы Польшчы і рускіх (украінскіх) зямель, якія знаходзіліся ў складзе Польскага каралеўства (Львоўскай, Перамышльскай, Бэлзскай, Холмскай, Галіцкай і Падольскай), прычым некаторыя з іх маглі быць створаны ў гэты перыяд [13, s.43–75].

Панаванне вялікага князя Аляксандра Казімеравіча (1492–1506), верагодна, не прынесла папаўнення ў скарбонку зямельных гербаў ВКЛ. На гравюры са *"Статуту"* Яна Ласкага (1506), які прадстаўляе манарха ў атачэнні Сенату і гербаў зямель Польскага каралеўства, сярод апошніх ад ВКЛ былі змешчаны толькі дзяржаўная "Пагоня" і "Калюмны" [15, s.63]. На жаль, іншых матэрыялаў па зямельнай геральдыцы ВКЛ з гэтага перыяду нам адшукаць не ўдалося.

Затое значныя змяненні ў зямельнай геральдыцы ВКЛ адбыліся ў часы Жыгімонта Старога (1506–1548). Нейкія важкія прычыны абумовілі наступны набор гербаў на яго вялікай пячатцы[8]: акрамя дзяржаўнай "Пагоні" там былі змешчаны бацькаў і матчын, а таксама тры зямельныя гербы – геральдычны крыж (Валыні), архангел Міхаіл (Кіеўскі) і ўзняты мядзведзь (Жамойці). Расшыфроўка гербаў аблягчаецца тым, што ўсе яны былі падпісаны на адмысловых стужках: *"VOLNI"*, *"KIИES"*, *"SAMAGITIE"*[9] [5, с.19–20; 19, с.122–123]. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што стары кіеўскі герб з ідучым мядзведзем быў заменены на новы з выявай арханёла. У той жа час, узняты мядзведзь стаў гербам Жамойці. Адзначым, таксама, што падбор гербаў у цэлым адпавядаў тытулу Жыгімонта Старога, пададзенаму на пячатцы: *"+SIGISMVDVS DEI GRATIA MAGNVS DVX LITHWANIAE* ["Пагоня"], *RVSE* [крыж, арханёл Міхаіл], *SAMAGITHIE* [узняты мядзведзь] *+ETS"* [19, с.123].

Што датычыць арханёла Міхаіла, то быў гэта, паводле украінскіх даследчыкаў К.Гламозды і Д.Янеўскага, ужо не зямельны герб ці герб княства, а герб ***Кіеўскага ваяводства***, якое было ўтворана ў складзе ВКЛ у 1471 г.[10] [20, с.50]. Марцін Бельскі пад гэтым годам адзначыў: *"...а княства Кіеўскае змянілі на правінцыю або павет, дзе Марціна Гаштольда літвіна прызначыў [Казімер Ягайлавіч] на ваяводства"* [17, s.452]. Можна меркаваць, што замена гербу адбылася пры змене адміністрацыйнага статусу – прыператварэнні зямлі ці княства ў ваяводства. Калі ж быў створаны герб Кіеўскага ваяводства? Ёсць два варыянты адказу на пастаўленае пытанне: або гэта адбылося ў час ці пасля ўтварэння ваяводства ў 1471 г., а значыць яшчэ пры Казімеры Ягайлавічу, або герб з'явіўся пры Жыгімонце Старым у 1506 г., што больш верагодна. На нашу думку, ускосна з новым гербам Кіеўшчыны была звязана атрыманая ў 1507 г. ад Жыгімонта Старога ўстаноўчая грамата, якая гарантавала гэтай зямлі пэўныя аўтаномныя правы [21, Т.4, с.166]. На карысць таго, што герб Кіеўскага ваяводства з выявай анёла ўпершыню з'явіўся ў пачатку XVI ст., сведчыць адначасовае з'яўленне з ім узнятага мядзведзя ў якасці жамойцкага гербу.

---

[8] Вядомая з 1506 г. [гл.: Polska. Jej dzieje i kultura od czasów najdawniejszych do chwili obecnej.– Warszawa, 1928.– T.1.– s.229–300, fot.5].

[9] Дарэчы, гэты факт трэба адзначыць асабліва, бо подпісы да гербаў на пячатцы былі зроблены ўпершыню. На нашу думку, гэта яшчэ раз сведчыць на карысць таго, што сярод старых былі новыя гербы, якія патрабавалі расшыфроўкі.

[10] Першыя ваяводствы ў ВКЛ былі ўтвораны ў 1413 г. на вядомым Гарадзельскім сойме. Спачатку гэта былі Віленскае і Троцкае ваяводствы. Пазней з'явіліся Кіеўскае (1471), Полацкае (1504), Наваградскае (1507), Віцебскае (1508) і Падляшскае (1513–1520) [21, Т.2, с.240]. Жамойць захавала за сабой назву староства [22, с.257].

Можна меркаваць, што герб ***Жамойцкай зямлі***: у чырвоным полі чорны мядзведзь з белым ашыйнікам [14, s.919], быў створаны ў тым жа 1506 г.[11] Варта згадаць, што 22.08.1492 г. Жамойць атрымала ад вялікага князя літоўскага Аляксандра Казімеравіча прывілей, які зацвярджаў правы і вольнасці, што раней далі князі Вітаўт і Казімер, ураўноўваў у правах жамойцкую шляхту з літоўскай і даваў ёй права выбіраць старосту і цівуноў [22, с.256; 23, с.483]. Цікава, што пра Жамойць у першым жа пункце прывілея асабліва адзначалася: *“...Напервей хочем, им жадный не мает мовити, альбо на очи иститъ, иж бы през меч, альбо через оныя валки были звалчоныя, але з доброю волею пристали [да ВКЛ]...”* [5, с.21]. 23.11.1507 г. новы прывілей даў жамойцкай шляхце Жыгімонт Стары [23, с.483]. Верагодна, што спачатку ў 1506 г., як і ў выпадку з гербам Кіеўскага ваяводства, быў нададзены герб Жамойцкай зямлі (па сутнасці, перарабілі стары кіеўскі), прычым ашыйнік у мядзведзя яскрава паказваў характар яе ўваходжання ў склад ВКЛ. Забягаючы наперад, трэба заўважыць, што гэта былі не ўсе зямельныя гербы, створаныя ў час панавання Жыгімонта Старога.

Парадак, які ўпершыню быў выкарыстаны для размяшчэння гербаў на сваёй вялікай пячатцы Жыгімонтам Старым, захаваўся і на пячатках апошняга Ягайлавіча – Жыгімонта Аўгуста (1548–1572) [19, с.124–125]. Ён замяніў толькі матчын герб, змясціўшы герб Сфорцаў. Кіеўскі і Жамойцкі былі пакінуты без змен, а ў Валынскім геральдычны крыж змяніў свой кшталт – яго канцы перасталі даходзіць да краёў тарчы [19, с.124].

У 1562 г. у Антвэрпене (другое выданне ў 1572 г.) Марк Амброжы з Нысы выдаў *“Arma regni Poloniae”* [10, Nr.11, s.168; Nr 12, s.177–178]. Акрамя зямельных гербаў Польскага каралеўства (сярод якіх: галіцкі, перамышльскі, прускі, львоўскі, бэлзскі, холмскі, падольскі) і гербу Тэўтонскага Ордэну, ВКЛ было прадстаўлена дзяржаўнай “Пагоняй” і “Калюмнамі”[12] [10, Nr 12, s.183]. Як *“Smolenschiensis Terra”*, г.зн. *“Смаленская Зямля”* быў падпісаны ўжо вядомы нам чатырохчастковы герб Фёдара Юр’евіча, князя Беларусі і Смаленска [10, Nr.11, s.169–170]. Павінен быў быць у гербоўніку і герб Жамойцкай зямлі, пра што сведчыць надпіс *“Samogithiae Terra”*, але ні ў першым, ні ў другім выданнях Марк Амброжы яго не змясціў [10, Nr.11, s.169; Nr 12, s.185]. З гэтага можна зрабіць выснову, што аўтар слаба ведаў зямельную геральдыку ВКЛ, а Жамойцкі герб быў яшчэ малавядомы.

Герб роду Сфорцаў з пячаткі С.Баторыя (1576)



У час панавання Жыгімонта Аўгуста да ВКЛ у 1566 г. былі далучаны Інфлянты, якія атрымалі ад вялікага князя герб: *“...Грыфа белага, узнятага на ногі, у чырвоным полі, трымаючага меч каля правай нагі, а на грудзях літары: S.A., якія азначаюць: SIGISMUNDUS AUGUSTUS”* [26, s.165, 167].[13] Варта звярнуць на гэтую геральдычную выяву ўвагу, бо, па сутнасці, у ёй мы бачым спалучэнне элементаў дзяржаўных гербаў

[11] У сувязі з гэтым, нашу ранейшую думку аб тым, што герб Жамойці з’явіўся на этапе – канец XIV–першая палова XV ст. (гл. № 1 “ГL”, с.4), мусім прызнаць як памылковую. Стварэнне жамойцкага гербу ў пачатку XVI ст. супадае таксама з паведамленнямі беларуска-літоўскіх летапісаў аб *“гербе Урсін”* (ад лац. *“Ursus”* – “мядзведзь”), што, на думку А.Цітова, сведчыць аб рэдактарскай працы над апошнімі *“жмудскіх ідэолагаў”* [1, с.91]. Падобнае супадзенне невыпадковае, яно, на наш погляд, сведчыць аб маладосці гербу, якому паспрабавалі прыдумаць старажытнае паходжанне з Італіі і ўпісаць у вядомае паданне аб Палемоне.

[12] Цікава, што “Калюмны” у першым выданні падпісаны: *“Lithvanie Terra”*, а ў другім – *“Duc.[atus] Litvaniae”*, г.зн. як зямельны або нават як дзяржаўны герб [10, Nr.12, s.185]. Паводле расійскай даследчыцы Н.А.Собалевай, успрыманне ў Маскоўскай дзяржаве Полацка як “літоўскага горада” прывяло да таго, што пасля яго захопу ў 1563 г. маскоўцамі, цар Іван IV змясціў на сваёй вялікай пячатцы (1577 г.) “Калюмны” з надпісам *“Печать полотцкая”* [24, с.155, с.226, мал.3/б; 25, с.213–214].

[13] Дакладнае яго апісанне такое: *“...in campo rubro Gryphum album erectum, & dextro pede anteriore gladium strictum gestantem, in pectore vero, primas seu initiales literas aureas Nominis Nostris cilicet S. & A. simul conjunctas cum supra posita iisdem literis corona prout eadem pictores industria accuratius hic concepta & expressa cernitur...”* [26, s.182].

ВКЛ (меч), Польшчы (арліная галава грыфа) і асабістых ініцыялаў манарха. Наданне гербу Інфлянтам сведчыць як аб працягу, так і пэўным механізме гербатворчага працэсу ў ВКЛ, а пасля Люблінскай уніі 1569 г. і ў Рэчы Паспалітай. Можна заўважыць, што існавалі пэўныя прынцыпы стварэння новых зямельных гербаў. Па-першае, іх аўтарамі максімальна выкарыстоўваліся ўжо існуючыя геральдычныя выявы, у якіх змяняўся толькі або іх колер, або колер поля. Па-другое, да іх дадаваліся ці адкідваліся пэўныя як дробныя, так і істотныя элементы, пры гэтым, крыніцай апошніх з'яўляліся дзяржаўныя гербы ВКЛ і Польшчы.

Пачынаючы з пячатак Генрыха Валуа (1573–1574) у сфрагістыцы вялікіх князёў літоўскіх пачынаюць з'яўляюцца памылкі. А.Цітоў апублікаваў яго пячатку ад 1574 г., праўда, малачытэльную [19, с.126–127]. Наколькі па ёй можна меркаваць, гербы Кіеўшчыны, Жамойці і Валыні былі пакінуты на месцы. Акрамя гэтага быў далучаны да гербаў бацькі і маці Жыгімонта Аўгуста складаны бацькоўска-матчын герб самога Генрыха Валуа: тарча падзеляна на дзве часткі, у правай палова гербу тры ліліі, у левай – палова гербу роду Медзічы. Памылка заключалася ў спалучэнні захаваных гербаў бацькі і маці апошняга Ягелона і сямейнага гербу Валуа.[14]

Пасля абрання на трон ВКЛ Стэфана Баторыя (1576–1586) згаданая памылка была паўторана на яго першай вялікай пячатцы, якая захавалася на дакуменце з 20.05.1580 г. у фондах ГДГАМ [27, КП № 9219, арк.1; 28, с.118–119, 125–126, фота]. У цэнтры яе – дзяржаўны герб "Пагоня" з тарчай, на якой змешчаны "Воўчыя зубы" – родавы герб вялікага князя літоўскага і караля польскага. Над ім – польскі "Арол" з надпісам *"PATERNUM"*, далей, бацькоўска-матчын герб Валуа з надпісам *"MATERNUM"* (?!), затым арханёл – герб Кіеўшчыны (*"KIOVEN"*), узняты мядзведзь з ашыйнікам – памылкова названы Смаленскім[15] (*"SMOLNEN"*), крыж Валыні (*"VOLINEN"*) і вуж з дзіцём – зноў падпісаны *"MATERNUM"* ! Як вынікае з даты на самой пячатцы, зроблена яна была ў 1576 г., відаць, адразу пасля каранацыі.


Бацькоўска-матчын герб Г.Валуа з пячаткі С.Баторыя (1576)


Герб Кіеўскага ваяводства з пячаткі С.Баторыя (1576)


Герб Жамойці памылкова падпісаны як Смаленскі з пячаткі С.Баторыя (1576)

Памылкі былі такія відавочныя, што ў 1581 г. для Стэфана Баторыя была выраблена новая вялікая пячатка ВКЛ. На ёй памылкі былі ўжо выпраўлены: дзяржаўная "Пагоня" падавалася з падвойным крыжам на тарчы, польскі "Арол" быў падпісаны *"POLO REG"*, замест гербаў Валуа і Сфорцаў былі ўведзены "Калюмны" і "Воўчыя зубы" Баторыяў адпаведна, з подпісам да апошняга *"REGI"*. "Калюмны", "Арханёл", "Мядзведзь узняты з ашыйнікам", "Крыж" былі падпісаны стандартна *"TER MDL"*, што ў адносінах да першага гербу было памылкай[16] [19, с.128–129; 27, КП № 2769, арк.1].

[14] З іншага боку, можа такім чынам хацелі падкрэсліць пераемнасць?
[15] Гэтая памылка, магчыма, была ўжо на пячатцы Генрыха Валуа.
[16] Герб "Калюмны", які быў дынастычным гербам галіны Гедымінавічаў – Кейстутавічаў, тут названы зямельным гербам ВКЛ. Аднак, сталае называнне яго такім сведчыць, што сапраўдная прыналежнасць "Калюмнаў" у часы Жыгімонта Аўгуста была забытая і яму быў нададзены статус другога дзяржаўнага гербу ВКЛ [30, s.126].

У 1584 г. выйшла з друку, прысвечаная Стэфану Баторыю, кніга Барташа Папроцкага – *“Herbarz Polski”*, дзе аўтар падае тагачасны стан ведаў аб зямельнай геральдыцы ВКЛ [14]. Трэба адразу адзначыць, што Б.Папроцкі меў аб ёй даволі цьмяныя ўяўленні. Аб гэтым сведчыць пералік тых гербаў, якія ён змясціў у сваім *“Гербоўніку”*.

Так, паводле Б.Папроцкага, ***Віленскае ваяводства*** ўжывала герб, тарча якога дзялілася на тры часткі, дзе былі выявы: *“...мужа на кані белым у чырвоным полі,*



Зменены герб Валыні з пячаткі С.Баторыя (1576)



Герб караля і вялікага князя С.Баторыя з яго пячаткі (1581)



Герб “Калюмны” (1581)

*мядзведзя чорнага ў полі зялёным і калюмны на чырвоным [полі]...”* [14, s.917]. ***Троцкае ваяводства*** мела за герб таксама *“каня”*[17] [14, s.918]. “Пагоня” была на гербах яшчэ такіх ваяводстваў, як: ***Віцебскае*** (у чырвоным полі), ***Падляшскае*** (у белым полі), ***Берасцейскае*** (у чырвоным полі), ***Менскае*** і ***Мсціслаўскае*** [14, s.920]. Вельмі верагодна, што Б.Папроцкі падаў гербы гэтых ваяводстваў, зыходзячы з выгляду іх харугваў. Апошнія ўсе мелі “Пагоню” і падрабязна апісаны А.Гваніні [16, ks.I, cz.II, s.262; ks.II, cz.II, s.110–113; ks.III, cz.II, s.22–26; ks.V, cz.III, s.30; 5, с.27].



Герб Валынскага ваяводства (1584)



Герб Кіеўскага ваяводства (1584)



Герб Наваградскага ваяводства (1584)



Герб Жамойцкай зямлі (1584)



Герб Смаленскага ваяводства (1584)

На нашу думку, у паведамленні Б.Папроцкага накладаліся адна на адную дзве інфармацыі – аб старых зямельных гербах і новых з выявамі “Пагоні”, якія адрозніваліся толькі ў дэталях і колерах. Апошнія з’явіліся ў працэсе уніфікацыі зямельнай геральдыкі ВКЛ у сувязі з адміністрацыйнай рэформай 1565–1566 г., што і было замацавана ў Статуце ВКЛ 1566 г.: *“...Теж мы Господарь даём под гербом того паньства нашого Великого князства Литовского, Погонею, печать до каждого повету...”* [5, с.24].

Разам з тым, Б.Папроцкі падаў некалькі гербаў, якія вылучаліся з агульнага шэрагу. У першую чаргу, гэта датычыла тых ваяводстваў, якія пасля Люблінскай уніі 1569 г. былі далучаны да Польшчы: *“**Ваяводства Валынскае**[18] ўжывае за герб крыж белы на чырвоным полі... **Ваяводства Кіеўскае** ўжывае за герб анёла белага на чырвоным полі...”* [14, s.918]. Па-другое, уласныя гербы мелі такія спецыфічныя тэрыторыі, як *“...**зямля Жмудзкая** ўжывае мядзведзя чорнага ў белым ашыйніку ў чырвоным полі...”* і ***ваяводства Смаленскае*** *“...ужывае харугвы чырвонай, ляска залатая ў полі шэрым...”* [14, s.919]. Калі пра Жамойцкі герб мы ўжо згадвалі раней, то

[17] Г.зн. “Пагоню”.

[18] Валынскае ваяводства было ўтварана

на гербе Смаленскага ваяводства варта спыніцца. Можна меркаваць, што яго стварэнне было звязана з утварэннем ваяводства ў 1508 г. [23, с.467]. Аднак, у 1514 г. Смаленск быў страчаны на карысць Расіі [29, с.12]. З гэтага года і да 1611 (а пасля з 1654 г.) Смаленскае ваяводства ў ВКЛ мела экстэрытарыяльны статус. Смаленская шляхта, вымушаная пакінуць свае маёнткі, збірала свае соймікі ў Вільні[19] [21, Т.2, с.272]. У сувязі з гэтым, робіцца магчымым аднесці на час панавання Жыгімонта Старога стварэнне цэлага шэрагу зямельных гербаў: Смаленскага (харугва), Кіеўскага (белы арханёл), Жамойцкага (узняты мядзведзь) і Навагрkörадскага (арханёл чорны).

Апошні яўна быў створаны як супрацьлеглы Кіеўскаму. Паводле Б.Папроцкага: *“…ваяводства Наваградскае… за герб анёла чорнага ў полі чырвоным…”* ужывае [14, s.919]. Варта адзначыць, што Наваградскае ваяводства было ўтворана ў 1507 г. [21, Т.5, с.257; 33, с.2]. З-за таго, што герб яго ствараўся на ўзор гербу Кіеўскага ваяводства 1506 г., яны былі вельмі падобныя і адрозніваліся адзін ад аднаго, як гэтага і патрабуюць правілы геральдыкі, толькі іншымі колерамі гербавай выявы, а таксама адсутнасцю у руках у наваградскага анёла мяча і похваў[20]. Вышэй згаданыя зямельныя гербы, створаныя ў пачатку XVI ст., сведчаць, што адбылося гэта ў рамках шырокай акцыі Жыгімонта Старога па ўпарадкаванню адміністрацыйнага падзелу ВКЛ, палітычнага статусу розных беларускіх і літоўскіх зямель і арганізацыі войска.

Пасля смерці С.Баторыя, у 1587 г. вялікім князем літоўскім быў абраны Жыгімонт III Ваза (1587–1632). З яго панаваннем звязана цэлая “рэвалюцыя” у зямельнай геральдыцы ВКЛ. Адзначаючы гэта, вядомы знаўца сфрагістыкі і геральдыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай М.Гумоўскі, пісаў, што назіраецца *“…надзвычайнае памнажэнне гербаў літоўскіх правінцый, якія часам нават акрэсліць нельга…”* [4, s.45].

На вялікай пячатцы Жыгімонта III Вазы, якая ўжывалася ў 1588–1621 г., вакол дзяржаўнай “Пагоні” былі змешчаны 12 гербаў, паводле М.Гумоўскага, такіх: “Арол” (польскі), “Сноп” (Вазаў), крыж (Валыні), рыцар (Троцкі), харугва (Смаленскі), алень (Люблінскі), галава (Падольскі), арханёл (Кіеўскі), две постаці (Северскі), узняты мядзведзь (Жамойцкі), “Калюмны” і “Пагоня” (Віленскі) [4, s.41]. Сярод знаёмых ужо нам гербаў зямель ВКЛ ёсць і незнаёмыя: алень (Люблінскі), галава (Падольскі) і две постаці (Северскі). М.Гумоўскі маляванне на пячатцы ВКЛ *“…гербаў каронных правінцый, такіх як Люблінскі, Валыні, Падолля і Украіны, на пячатках літоўскіх…”* называе памылкай [4, s.46]. На яго думку, яна была выклікана тым, што гэта былі гербы тых зямель *“…да якіх Літва мела прэтэнзіі”* [4, s.42]. Але ці сапраўды гэта было так?

Адказ на пытанне ляжыць у правільнай расшыфроўцы згаданых зямельных гербаў. Для пачатку параўнаем афіцыйныя тытулы С.Баторыя і Жыгімонта III Вазы, якія змешчаны на іх гербавых пячатках[21]. Як з іх вынікае, яны былі амаль ідэнтычныя, толькі ў Жыгімонта III Вазы знікла *“Падляшша”* і яго дзедзічныя ўладанні адрозніваліся ад Баторыевых. У сувязі з гэтым, тры вышэй згаданыя гербы звязваць з Люблінам, Падоллем і Севершчынай няма ніякіх падстаў. Па-першае, таму, што яны не згадваюцца ў тытуле вялікіх князёў літоўскіх. Смаленска–Северскія землі (Смаленск, Ноўгарад-Северскі і Чарнігаў) былі вернутыя ў склад Рэчы Паспалітай толькі па Дэўлінскаму перамір’і ў 1618 г. [19, с.131]. У сувязі з гэтым тытул быў павялічаны на *“SMOLENS: SEVERIES: CZARNIHOVIENS”* толькі на пячатках Уладзіслава IV Вазы (1632–1648) [19, с.137]. Па-другое, гербы Падолля і Люблінскага ваяводства добра вядомыя. Першы карыстаўся

[19] Ці не таму мядзведзь – стары герб Смаленскага княства-зямлі, толькі з пераблытанымі колерамі, апынуўся сярод гербаў Віленскага ваяводства?

[20] У сувязі з гэтым, розныя спробы звязаць чорнага анёла з Чорнай Руссю, наўрадці могуць быць плёнымі [31, с.32–33; 32, с.25].

[21] Стэфан Баторы: *“Stephanus Dei Gracia Rex Poloniae, Magnus Dux Lituanie, Russie, Prussie, Masoie, Samag[itie], Kiofie, Volin, Podla[chie], Livonie, Nec, Non Princeps Transilvanie Et”* і Жыгімонт III Ваза: *“Sigismvndvs Tertivs Dei Gratia Rex Poloniae, Magnvs Dvx Litvaniae, Rvssiae, Prvssiae, Samogitiae, Mazoviae, Kioviae, Volhiniae, Livoniaeqve Etc Non Sveco, Got: Van: Haere Rex Etc”* [34, s.118; 4, s.42].

гербам, дзе на тарчы была выява Сонца з чалавечым тварам, другі меў герб з выявай аленя, у якога на шыі была карона [14, s.909; 13, s.45–46, h.7, 16]. У нашым выпадку алень падаецца без кароны, а замест галавы ці ачалавечанага Сонца выразна чытаецца твар Ісуса на плашчаніцы, якая выглядае як княжацкі намёт (“Спас”).

Такім чынам, гербы: “Алень”, “Спас” і “Две постаці” павінны былі адносіцца да іншых зямель, якія ў час узыходжання на трон ВКЛ Жыгімонта III Вазы ўваходзілі ў склад Беларуска-літоўскай дзяржавы. Якіх жа зямель гэта былі гербы? Чаму іх дадалі ў вялікую пячатку толькі цяпер? Ці былі гэта гербы-прэтэнзіі на землі, якія ўваходзілі ў склад Кароны, як лічыў М.Гумоўскі?

Пачнем з адказу на апошняе пытанне. Гербамі-прэтэнзіямі на пячатках вялікіх князёў літоўскіх Жыгімонта Аўгуста (з 1569 г.), Генрыха Валуа, Стэфана Баторыя і Жыгімонта III Вазы можна лічыць гербы Валыні[22], Кіеўскага і Падляшскага ваяводстваў, далучаных да Польшчы пасля Люблінскай уніі (26.05, 05.06. і 05.03.1569 г. адпаведна), а таксама герб Смаленскага ваяводства, страчанага на карысць Масквы ў 1514 г. і адваяванага Жыгімонтам III Вазай у 1611 г. Таму, аўтары вялікай гербавай пячаткі ВКЛ наўрадці імкнуліся дадаць яшчэ тры герба такога ж характару. Гэта ўздымала б пытанне аб прэстыжы ВКЛ – што гэта за дзяржава, большая частка зямель якой страчана? У сувязі з гэтым, названыя вышэй гербы павінны былі належаць землям, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ. Падобнае меркаванне падмацоўваецца тым, што ў колькасць 12 гербаў быў вернуты стары герб Троцкага ваяводства, праўда, са зменай: рыцар з алебардай (замест дзіды) улева. На нашу думку, гэтымі землямі маглі быць толькі беларускія ваяводствы: Полацкае (з 1504 г.), Віцебскае (з 1508 г.), Падляшскае (з 1513 г.), Менскае (з 1565 г.), Мсціслаўскае (з 1565 г.) і Берасцейскае (з 1566 г.). Калі адкінуць тры апошнія, якія былі ўтвораны ў выніку адміністрацыйнай рэформы 1565–1566 г. і атрымалі ўжо уніфікаваныя ваяводскія гербы з “Пагоняй”[23], то застанецца якраз тры ваяводствы на тры вышэй згаданыя гербы. Але які з іх якому ваяводству належаў?


Герб “Алень” з пячаткі Яна III (1676)


Герб “Спас” з пячаткі Яна III (1676)


Герб “Две асобы” з пячаткі Яна III (1676)


Герб Троцкага ваяводства з пячаткі Яна III (1676)

Адказаць на гэтае пытанне даволі складана з-за таго, што ўяўленні аб зямельных гербах ВКЛ ужо ў XVIII ст. былі даволі цьмяныя нават сярод прафесіяналаў-геральдыстаў. Вось як апісваў цікавячыя нас гербы на вялікіх пячатках ВКЛ аўтар вядомага і папулярнага ў сярэдзіне XVIII ст. ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай геральдычнага трактата *“Heraldyka to jest osada kleynotów rycerskich”* (1752) Юзаф Аляксандр Ябланоўскі: *“...Две асобы, герб Біскупства і сталіцы Вільні, Алень, [герб] княства Віцебскага, бо разам з ваяводствам Люблінскім, якое таго ж за герб Аленя ўжывае, у ліку ваяводстваў на Сойме 1569 пакладзена...”* [35, s.39–40]. Здавалася б, што стольнік ВКЛ, якім з’яўляўся на той час Ю.А.Ябланоўскі, павінен быў іх ведаць дакладна. Аднак, яго паведамленне выклікае сумненні. Што да гербу “Две асобы”, то, па-першае, наўрадці

[22] Паводле Каспара Нясецкага, пасля далучэння Валыні да Кароны яе герб быў зменены: *“Konstytucya...1589 [roku]...do krzyża Orła mu polskiego przydała”* [38, s.177]. Відавочна, што зроблена гэта было з мэтай падкрэсліць прыналежнасць Валынскай зямлі да Польшчы і адрозніць яе герб ад таго, які ўжываўся на вялікіх пячатках ВКЛ. У тым жа годзе новаўтворанаму Брацлаўскаму ваяводству *“...Księżyc nie pełny i krzyż...za herb nadały...”* [38, s.220].

[23] Пра гэта сведчаць апісаныя А.Гваніні ваяводскія харугвы і сфрагістычны матэрыял, напрыклад, пячатка Берасцейскага ваяводства ад 1602 г. [1, с.47; 5, с.24]. Тое ж і ў Б.Папроцкага (гл.у тэксце).

сярод зямельных гербаў быў бы выкарыстаны герб Вільні і Віленскага біскупства. Па-другое, гербавая выява: на тарчы мужчына з мячом на пасе трымае за руку жанчыну, ніяк не адпавядае выказанай Ю.А.Ябланоўскім ідэі. Па-трэцяе, самае галоўнае, Віленскае біскупства і Вільня мелі ўласныя зусім адметныя гербы. Першае карысталася ад XV ст. такім гербам: у блакітным полі паміж дзвума каронамі залатымі ў пас такі ж крыж лацінскі ўнізе раздзёрты ў крокву [6, s.83, rys.13/11; 1, с.124]. Гербам Вільні з XV ст. была выява Святога Хрыстафора [36, с.136; 1, с.21]. Усё гэта дазваляе адхіліць сведчанне Ю.А.Ябланоўскага ў адносінах да гербу “Две асобы”.

Сумненне выклікае і атрыбутацыя “Аленя” як гербу Віцебскага княства. Утворанае замест яго ваяводства з’явілася не на Люблінскім сойме ў 1569 г., а ў 1508 г., тады як Люблінскае – значна раней – яшчэ ў 1473 г.[24], што яўна супярэчыць паведамленню Ю.А.Ябланоўскага [14, s.909]. Падабенства нашага “Аленя” на герб Люблінскага ваяводства сапраўды даволі блізкае. Паводле Б.Папроцкага, апошняе мела ў ім *“...Аленя рагатага, на шыі карона, у чырвоным полі”* [14, s.909]. У нашым жа гербе карона адсутнічала, а сам алень быў скіраваны ўлева. Калі напрамак гербавай выявы, з парушэннем правілаў геральдыкі, быў абраны для таго, каб захаваць сіметрыю сярод выяў гербаў, пакладзеных па колу вялікай пячаткі ВКЛ, то адсутнасць кароны на шыі аленя выразна адрознівала яго ад люблінскага варыянту. Тым не менш, падабенства двух гербаў, дазволіла Ю.А.Ябланоўскаму звязаць іх разам.

Што датычыць “Спаса”, то Ю.А.Ябланоўскі ўвогуле яго не заўважыў, хоць піша пра гэты герб двойчы. Першы раз так: *“Ex opposito Арла, накшталт твару сонца, якое носіць за герб Ваяводства Падольскае, і якога Літва за трох каралёў горача дамагалася, гэта значыць за панавання Казімера і двух сыноў яго Яна Альбрыхта і Жыгімонта Старога...”* [35, s.40]. Такім чынам, “Спас” быў зблытаны з гербам Падолля. Аднак, далей той жа аўтар піша: *“Як Каронная, так і Літоўская пячатка, канчаецца Галавой чалавечай з рагамі, адную карону на галаве, другую на шыі мае. Ёсць гэта старажытны герб зямлі Добжыньскай, якую сабе амаль цэлае стагоддзе Палякі з Літвой наўзаем выдзяралі”* [35, s.40]. Тут, як бачна, той жа самы “Спас” быў зблытаны ўжо з гербам Добжыньскай зямлі. Калі ж згадаць, што *“...муж збройны пешы з палашам збоку, дзідай ў руцэ...”* – герб Троцкага ваяводства, Ю.А.Ябланоўскі патлумачыў як знак *“...дзяржавы князямі Літоўскімі заваяванай, а потым адпадлай...”* [35, s.40][25], то становіцца зразумелым, што аўтар вельмі слаба арыентаваўся ў зямельнай геральдыцы ВКЛ. Толькі гербы *“княства Жмудзкага”* (“Мядзведзь узняты”), *“княства Кіеўскага”* (“Анёл”), *“ваяводства Валынскага”* (“Крыж”) і *“ваяводства Смаленскага”* (“Харугва”) былі ім вызначаны правільна [35, s.39–40].


Герб Жамойцкай зямлі з пячаткі Яна III (1676)


Зменены герб Кіеўскага ваяводства з пячаткі Яна III (1676)


Герб Смаленскага ваяводства з пячаткі Яна III (1676)

Наша спроба атрыбутацыі згаданых вышэй гербаў заснавана на некалькіх галоўных прынцыпах, якія можна заўважыць у зямельнай геральдыцы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Некаторыя з іх мы ўжо згадвалі. Па-першае, гэта даволі абмежаваная колькасць гербавых выяў, якая выкарыстоўвалася з гэтай мэтай. Па-другое, уся разнастайнасць гербаў дасягалася шляхам змянення колераў поля ці выяў і

[24] Марцін Бельскі адносіць гэтую падзею да сойму ў Пётркаве ў 1474 г.: *“...na tym że seymie oderwano czesc Woiewodztwa Sendomirskiego (ktore było nazbyt wielkie) na Woiewodztwo Lubelskie”* [17, s.462]

[25] Ю.А.Ябланоўскі угледзеў на вялікай пячатцы ВКЛ і такі герб: *“Лілія з крылам наўскос [!?]”*, пад якім, на нашу думку, трэба разумець бацькоўска-матчын герб Генрыха Валуа. Цікава, што падпісаў ён яго так: *“...herb państwa odpadłego...”* [35, s.40]!

ўнясення ў апошнія нейкіх адметнасцяў. На нашу думку, існаваў і трэці прынцып – блізкая сувязь зямельнай геральдыкі з гарадской.

Добрым прыкладам згаданых прынцыпаў з'яўляюцца гербы Наваградскага ваяводства і Наваградка. Апошняму ў 1595 г. Жыгімонтам ІІІ Вазай быў нададзены герб з выявай таго ж самага "Анёла", але з такім адрозненнем – у левай руцэ ён трымаў вагі [36, с.40, 56, 83, 202]. Відавочна, што герб гораду вынікаў з ваяводскага гербу. Вядома, таксама, што Віцебск на сваёй гарадской пячатцы 1559 г. меў выяву "Спаса" [36, с.82]. У 1597 г. той жа Жыгімонт ІІІ Ваза зацвердзіў такі Віцебскі гарадскі герб: *"...у блакітным полі абраз Спаса Збавіцеля...пры том трохі ніжэй меч голы чырвоны..."* [36, с.83]. А.Цітоў спалучэнне Спаса і мяча тлумачыць тым, што Віцебск з'яўляўся горадам Белай Русі і абарончым пунктам ВКЛ [36, с.83]. На нашу думку, да гэтага трэба дадаць, што меч, а таксама разварот выявы Спаса ў профіль [36, с.82] былі ўнесены для таго, каб адрозніць герб ваяводства і горада.

Такім чынам, герб "Спас" можна з вялікай доляй ўпэўненасці аднесці да ***Віцебскага ваяводства***. Час яго стварэння – гады кіравання Жыгімонта Старога, хутчэй за ўсё, каля 1508 г. – года ўтварэння Віцебскага ваяводства. Цікава, што ён належаў да той жа групы выяў рэлігійнага характару, што і выява анёла ў гербах Наваградскага і Кіеўскага ваяводстваў, утвораных у 1506–1507 г.. Але чаму пра "Спас" забыліся ўжо ў сярэдзіне XVIII ст.? На наш погляд, гэтаму былі дзве прычыны. Першая і галоўная – гэта уніфікацыя ваяводскай геральдыкі ВКЛ і пераход да "Пагоні" у 1566 г. У выніку, з'яўленне "Спаса" на пячатках Жыгімонта ІІІ Вазы ўжо адбывалася "па памяці", якая ў другой палове XVI ст. была яшчэ жывая. Другая – гэта падзеі першай паловы XVII ст. у Віцебску: паўстанне віцяблян супраць уніі і забойства Язафата Кунцэвіча ў 1623 г. прывялі да пазбаўлення гораду Магдэбургскага права, а разам з ім і гарадскога гербу. Апошні разам з самакіраваннем аднавіліся толькі ў 1644 г.[26] [36, с.137]. Нейкі негатыўны ўплыў мела гэта і на ваяводскі герб. Цікава, што на пячатцы Віцебскай ратушнай канцылярыі 1684 г. "Спас" быў змешчаны ў класічнай форме. Аднак, ад выявы ваяводскага гербу яго адрознівала наяўнасць прамяністага німбу [19, с.192, 202, № 5].

Герб "Две асобы": на тарчы мужчына з мячом на пасе трымае за руку жанчыну, вельмі выразна сімвалізуюць шлюб, саюз або унію. На нашу думку, ёсць падставы аднесці яго да ***Падляшскага ваяводства***. Па-першае, гэтае ваяводства было ўтворана ў 1513–1520 г., будучы вылучана са складу Троцкага [21, Т.2, с.240 (1513); Т.5, с.373 (1520)]. Вось чаму гербы іх вельмі блізкія – троцкі рыцар, згубіўшы латы і дзіду, захаваў толькі меч на пасе, а ў гербавую выяву да яго была далучана жаночая постаць. Па-другое, унія паміж ВКЛ і Польшчай ці інтэграцыйныя працэсы мацней адчуваліся менавіта на памежным Падляшшы і нездарма, пасля далучэння да Кароны ў 1569 г., Падляшскае ваяводства атрымала герб з той жа ідэяй саюза двух дзяржаў: тарча падзеляна на две часткі, у правай – польскі "Арол", у левай – "Пагоня" [5, с.30]. Паводле апісання Каспара Нясецкага, ён выглядаў так: *"...заднаго боку ёсць арол белы ў чырвоным полі, з другога боку звычайная Пагоня літоўская..."* [38, s.205]. Магчыма, герб "Две асобы" сімвалізаваў і сапраўдны шлюб Жыгімонта Старога з Бонай Сфорцай, які адбыўся ў 1518 г. Тады вылучэнне Падляшскага ваяводства са складу Троцкага ў 1513–1520 г. выглядае як шлюбны падарунак, бо менавіта на Падляшшы знаходзіліся найбольш значныя рэзыдэнцыі вялікіх князёў літоўскіх. Усё гэта дазваляе аднесці час стварэння згаданага вышэй гербу на час панавання Жыгімонта Старога.

Метадам выключэння, трэйці герб "Алень" павінен належаць ***Полацкаму ваяводству***. Старажытная Полацкае княства было адной з тых зямель ВКЛ, якая карысталася пэўнай аўтаноміяй (таксама як Віцебская, Валынская, Кіеўская, Жамойцкая і

[26] *"Віцебскі летапіс"* гаворыць аб гэтым так: *"У год 1635. У Кашчэвічах віцебляне на чале з Клачкоўскім разбілі чатыры тысячы маскоўцаў, за гэта вернуты ім усе вольнасці і магдэбургія, бо за забойства благаславёнага Язафата гэта ўсё, вольнасці і магдэбургія, было ад іх забрана"* [37, с.263].

інш.). Полацк ужо у канцы XIV ст. меў пячатку без якой-небудзь выявы, а толькі з надпісам *"Печать Полоцькая и С[ве]тое Софьи"* [39, с.140–141, с.138, мал.11; 40, с.28, фота 8]. У 1498 г. у часы кіравання вялікага князя літоўскага Аляксандра Казімеравіча Полацк атрымаў Магдэбургскае права [41, с.167; 21, Т.5, с.519]. У 1503 г. той жа Аляксандр зацвердзіў полацкаму праваслаўнаму архіепіскапу правы і прывілеі суда па пытаннях царкоўнага, грамадскага і сямейнага жыцця насельніцтва. Паводле Полацкіх прывілееў, архіепіскап узначальваў мясцовы сойм Полацкай зямлі, а потым (з 1504 г.) Полацкага ваяводства да адміністрацыйных рэформаў 1564–1566 г., калі былі ўтвораны шляхецкія соймікі [42, с.452]. У сувязі з гэтым, становіцца зразумелай постаць *"епіскапа ў мітры з пастаралем у левай руцэ"*, якая стаіць на трохмачтавым караблі на пячатцы Полацка, што ўжывалася да 1561 г. [19, с.225]. У 1580 г. С.Баторы падцвердзіў Полацку Магдэбургскае права і надаў *"...до печати мейской герб, корабль окрентовай, которого и перед тым место Полоцкое ужывало..."* [36, с.68]. Праўда, постаці архіепіскапа на караблі ўжо не было [41, с.167; 36, с.68, 216].

Розніца паміж гарадскім гербам ("Карабель") і ваяводскім ("Алень") сведчыць, што апошні з'явіўся пазней за першы. Калі б гэта было інакш, то полацкі гарадскі герб быў бы падобны на ваяводскі, як гэта адбылося з наваградскім і віцебскім гербамі. У сувязі з гэтым, узнікае праблема часу стварэння гербу Полацкага ваяводства. Ёсць тры варыянты. Першы – "Алень" Полацкай зямлі быў нададзены яшчэ Казімерам Ягайлавічам зімой 1470 г., калі ён разам з жонкай і панамі літоўскімі наведаў Полацк, Віцебск і Смаленск [17, s.451]. У гэтым выпадку, вельмі падобны герб Люблінскаму ваяводству быў у 1473 г. нададзены на ўзор Полацкага. Праўда, Ян Длугаш пісаў, што ўжо пад Грунвальдам (1410 г.): *"Дзявятая харугва зямлі Люблінскай, мела на сцягу аленя з длінными рогамі на белым полі..."* [12, с.85], аднак, гэта храналагічна супярэчыць звесткам аб утварэнні Люблінскага ваяводства. Другі варыянт – "Алень" быў нададзены Аляксандрам Казімеравічам пасля ператварэння Полацкай зямлі ў 1504 г. у ваяводства. Адбылося гэта ўжо пасля надання Магдэбургскага права Полацку.[27] Тым не менш, на нашу думку, больш верагодным з'яўляецца трэці варыянт, у якім прасочваецца сувязь полацкага ваяводскага герба з гербам Горадні. Як вядома, гербам апошняга быў алень з крыжам паміж рагоў, пераскокваючы цераз плот ("гародню"). Быў ён нададзены гораду ў 1540 г. маці Жыгімонта Аўгуста Бонай Сфорца, пра што сведчыць і сфрагістычны матэрыял [36, с.150; 19, с.192–193]. Можна меркаваць, што адначасова ці пазней быў нададзены "Алень" і Полацкаму ваяводству.[28] Так, у 1547 г. апошняе атрымала ад Жыгімонта Аўгуста земскую грамату з падцверджаннем сваіх асаблівых правоў у ВКЛ [23, с.467].

У 1987–1988 г. пад час археалагічных раскопак у Полацку быў знойдзены каменны штамп-матрыца, які на сваіх баках меў дзве выявы – "Пагоню" і бягучага аленя [45, с.5; 46, с.19]. С.Тарасаў і У.Мілюцін аднеслі знаходку да канца XVI–пачатку XVII ст., а "Аленя" растлумачылі як герб Віцебскага ваяводства, спаслаўшыся на ўжо вядомае нам сведчанне Ю.А.Ябланоўскага [45, с.7]. Праўда, самое пытанне: чаму штамп з гербам Віцебскага ваяводства апынуўся ў Полацку, выклікае сумненні ў такой атрыбутацыі. Згаданыя

---

[27] З 1507 г. вядомы Аляксандр Пятух – *"хоружы Полоцкий"* [гл.: 43, Т.3, с.8, № 273]. Але ці насіў ён на сцягу "Пагоню", як падае Ян Длугаш, апісываючы бітву пад Грунвальдам [12, с.91], ці "Аленя" – цяжка сказаць.

[28] Той факт, што люблінскі "Алень" упершыню быў змешчаны на вялікай каронная пячатцы менавіта ў караля Жыгімонта Старога (1548) [44, fot.22], робіць магчымым аднесці час стварэння гербу Полацкай зямлі з выявай аленя ўвогуле на пачатак XVI ст. Цікава, што К.Нясецкі, спасылаючыся на *"Гісторыю"* Гендэнштэйна, адносіў утварэнне Полацкага ваяводства на час пасля 1500 г., калі *"Літва, бачучы шчуплы рэестр сваіх сенатараў, на ўзор Польшчы болей іх да [свайго] сенату абрала, а менавіта: Полацкага, Наваградскага, Віцебскага. Пры уніі ж В[ялікага] Княства з Каронай, ваяводзе полацкаму месца адразу за люблінскім запісалі ў 1569 годзе..."* [38, s.187]. Адзначым паведамленне аб месцы ў сенаце Рэчы Паспалітай полацкага ваяводы, якое яшчэ раз даказвае памылковасць інфармацыі Ю.А.Ябланоўскага.

аўтары спрабуюць адказаць на яго, дапускаючы існаванне Віцебскай мытні ў Полацку [45, с.8–9], але гэта яўная нацяжка. Усё становіцца на свае месцы, калі ў выяве бягучага аленя бачыць герб Полацкага ваяводства. Сама выява на матрыцы вельмі падобная на гарадзенскую, з той толькі розніцай, што адсутнічае плот[29] і крыж паміж рагоў, як і патрабуюць законы геральдыкі. Пазней, у часы панавання Жыгімонта III Вазы, відаць, пад уплывам гербу Люблінскага ваяводства, полацкі "Алень" спыніў свой бег і стаў ідучым.

Такім чынам, на вялікай пячатцы Жыгімонта III Вазы былі змешчаны, акрамя польскага "Арла" і дынастычных "Калюмнаў", гербы наступных ваяводстваў: Валынскага ("Крыж"), Троцкага ("Рыцар з алебардай"), Смаленскага ("Харугва"), Полацкага ("Алень"), Віцебскага ("Спас"), Кіеўскага ("Анёл"), Падляшскага ("Две асобы"), Віленскага ("Пагоня") і староства Жамойцкага ("Узняты мядзведзь") [19, с.130–131]. Галоўнай прычынай, якая паўплывала на тое, што гэтыя гербы ўзгадалі і сабралі разам, на нашу думку, з'яўлялася простае жаданне аўтараў вялікай пячаткі ВКЛ, па-першае, паказаць адзінства дзяржавы і яе магутнасць, па-другое, нагадаць яшчэ раз аб страчаных і спрэчных тэрыторыях, па-трэцяе, падагнаць сваю пячатку пад вялікую пячатку Польшчы.

Усе згаданыя гербы без змен паўтараюцца на вялікіх пячатках наступных прадстаўнікоў дынастыі Ваза на троне ВКЛ і Рэчы Паспалітай – Уладзіслава IV (1632–1648) і Яна Казімера (1648–1668) [19, с.134–138]. Аднак, на вялікай пячатцы Міхала Карыбута Вішнявецкага (1669–1673) да звыклага набору быў далучаны герб з выявай ідучага мядзведзя, прычым захоўваўся і жамойцкі "Узняты мядзведзь" [19, с.142–143]. Гэтую ж з'яву можна пабачыць на пячатках Яна III Сабескага (1674–1696)[30], Аўгуста II (1697–1706, 1709–1733) і Аўгуста III Сасаў (1733–1763), а таксама Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764–1795)[31] [19, с.144–155; 27, КП № 9216, арк.1, КП № 15113, арк.4 адв.]. Да якой жа зямлі згаданы герб адносіўся?

Паводле легенды на пячатцы, Міхал Карыбут Вішнявецкі захаваў у сваім тытуле *"SMOLENSCIAE.SEVERIAE.CZERNIECHOVAE"*, якія былі страчаны на карысць Расіі яшчэ пры Яне Казімеры Вазе. Відаць, ідучы мядзведзь адносіўся да адной з гэтых зямель. Улічваючы тое, што смаленская "Харугва" была на месцы, застаюцца Севершчына і Чарнігаўшчына. Яшчэ ў 1633 г. на сойме Уладзіслаў IV надаў правы і вольнасці Чарнігаўскай зямлі. Было ўтворана ваяводства з двума паветамі – Чарнігаўскім і Ноўгарад-Северскім. На тым жа сойме Чарнігаўскаму ваяводству быў нададзены герб: чорны двухгаловы арол з распраўленымі крыламі з каронай над галовамі і ініцыяламі манарха на грудзях [47, с.51; 38, s.230].[32] Застаецца толькі Севершчына. Яна ўваходзіла як павет у Смаленскае ваяводства, таму не мела ўласнага гербу. Відаць, у сувязі з гэтым стары герб Смаленскай зямлі – ідучы мядзведзь быў зноў далучаны ў лік зямельных гербаў ВКЛ, але адносіўся ён ужо да ***Северскай зямлі***.

---

[29] Тут алень бяжыць па полю, аб чым сведчыць раслінны арнамент. Можа гэта мела таксама нейкі сэнс: "гародня" – Горадня, "поле" – Полацк?

[30] Праца над зямельнымі гербамі ў Рэчы Паспалітай працягвалася і ў другой палове XVII ст. Паводле К.Нясецкага, *"Зямлі Жыдачоўскай з-за таго, што са Львоўскай [зямлёй] сыходзіцца, Канстытуцыя сойму каранацыі караля Яна III 1676 [году] герб ёй [такі] надала: тры львы на харугві блакітнай…"* [38, s.173].

[31] Варта таксама адзначыць, што адначасова на вялікіх каронных пячатках, пачынаючы ад таго ж Міхала Карыбута Вішнявецкага (1669) і завяршаючы Станіславам Аўгустам Панятоўскім (1780) , з'яўляецца герб Падолля – "Сонца" [44, f.43, 45, 50, 55–57].

[32] Трэба адзначыць, што выява двухгаловага арла была добра вядомая ў зямельнай геральдыцы Польшчы і з'явілася там раней, чым яна стала дзяржаўным гербам Расіі. Ужо ў 1410 г., паводле Яна Длугаша, *"…чатырнадцатая харугва, зямлі Перамышльскай, мела на сцягу жоўтага арла з двума галовамі, павернутымі раўнамерна ў розныя бакі, у блакітным полі…"* [12, с.89; 13, s.45, h.9]. Разам з тым, наданне менавіта чорнага двухгаловага арла з манаграмай Уладзіслава IV Чарнігаўскаму ваяводству, на нашу думку, не толькі было следаваннем асноўным прынцыпам гербатворчасці ў Рэчы Паспалітай, але і сімвалізавала перамогу над Расіяй.

Такім чынам, можна сцвярджаць існаванне наступных зямельных гербаў ВКЛ: Віленскага, Троцкага, Валынскага, Жамойцкага, Кіеўскага, Смаленскага, Полацкага, Віцебскага, Падляшскага, Інфлянцкага, Берасцейскага, Менскага, Мсціслаўскага, Северскага і Чарнігаўскага. Кожны з іх яшчэ патрабуе глыбокага вывучэння з мэтай вызначэння іх генезісу і сферы ўжытку, удакладнення датаў стварэння, а таксама поўнага геральдычнага апісання колераў поля і выявы. Разам з тым, само багацце зямельнай геральдыкі ВКЛ мае сёння вялікае практычнае значэнне, бо дазваляе скласці Вялікі Герб Беларусі, які, на нашу думку, павінен складацца з "Пагоні" у цэнтры і гербаў Полацкага, Віцебскага, Наваградскага, Троцкага (Гарадзеншчына), Віленскага (Браслаўшчына, Ашмяншчына, Лідчына), Кіеўскага (Мазыршчына), Мсціслаўскага, Берасцейскага, Менскага і Падляшскага ваяводстваў, Северскай зямлі (Гомельшчына) і "Калюмнаў".



Герб Северскай зямлі з пячаткі Яна III (1676)

*Аляксей Шаланда*

## Літаратура і крыніцы:


1. Цітоў А. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі.– Мн.: РІВШ БДУ, 1999.– 176 с.
2. Пікарда Г. Алегарычная геральдыка Францыска Скарыны і кароткі дапаможнік па беларускай геральдыцы.// Спадчына.– 1993.– № 2.– С.58–74.
3. Амбелен Р. Драмы и секреты истории. 1306–1643: Пер. с франц. — М.: Изд. группа "Прогресс", "Прогресс–Академия", 1992.— 304 с.
4. Gumowski M. Pieczęcie książąt Litewskich.// Atheneum Wileńskie (AW).– Wilno, 1930.– R.VII.– zeszyt 3–4.– S.684–725, 9 tabl.
5. Цітоў А. Наш сімвал – Пагоня: шлях праз стагоддзі.— Мн.: Полымя, 1992.– 40 с.
6. Heymowski A. Herby polskie w Sztokholmskim Codex Bergshammer.// Studia źródłoznawcze.– Warszawa, Poznań, 1967.– T.12.– S.73–111.
7. Łojko J. Chorągwie polskie i litewskie w bitwie pod Grunwaldem.// LSP.– Poznań, 1989.– Studia historica.– T.3.– S.141–154.
8. Бохан Ю. Узбраенне вершнікаў Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV–пачатку XV ст. (па матэрыялах княскіх пячатак).// З глыбі вякоў. Наш край: Гіст.-культуралаг.зб.– Мн.: Навука і тэхніка, 1996.– Вып.1.– С.236–244.
9. Сперансов Н.Н. Земельные гербы России.– М.: Изд-во "Советская Россия", 1974.– 198 с.
10. Wdowiszewski Z. Marek Ambroży z Nissy i jego "Arma regni Poloniae" z 1562 r.// Miesięcznik heraldyczny.– Warszawa, 1934.– R.XIII.– Nr 11.– S.166–170; Nr 12.– S.177–186.
11. Белы А. Хроніка Белай Русі.– Мн.: "Энцыклапедыкс", 2000.– 235 с.
12. Длугош Я. Грюнвальдская битва.– М., Л.: Изд-во АН СССР, 1962.– 212 с.
13. Muczkowski J. Jana Długosza kanonika katedr. krak. Banderia Prutenorum tudzież Insignia seu Clenodia Regni Poloniae.– Kraków, 1875.– 75 s., 16 tabl.
14. Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego 1584.– Kraków, 1858.— 964 s.
15. Łojko J. Sredniowieczne herby polskie.– Poznań, 1985.– 150 s.
16. Gwagnin A. Kronika Sarmacyey Europskiey.– Kraków, 1611.— 703 s.
17. Bielski M. Kronika polska.– Kraków, 1597.– 804 s.
18. Gumowski M. Pieczęcie królów Polskich.// Wiadomości numizmatyczno-archeołogiczne (WNA).– Kraków, 1909.– Nr 10.– S.190–192, tabl.IV, Nr 26; Nr 11.– S.207–208.
19. Цітоў А.К. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі.— Мн.: Полымя, 1993.— 239 с.
20. Гломозда К.Ю., Яневський Д.Б. Історичні гербові, відзнаки та прапорові барви України.// Український історичний журнал.– 1990.– № 4.– С. 43–55.
21. ЭГБ: У 6 т.– Мн.:БелЭн, 1994.– Т.2.– 537 с.; 1997.– Т.4.– 432 с.; 1999.– Т.5.– 592 с.
22. Литва: Краткая энциклопедия.– Вильнюс, 1989.– 672 с.
23. Статут ВКЛ 1588: Тэксты, даведнік, каментарыі.— Мн.: БелСЭ, 1989.— 573 с.
24. Соболева Н.А. Российская городская и областная геральдика XVIII–XIX в.– М.:Наука,1981.– 262 с.
25. Соболева Н.А. Русские печати.– М.: Наука, 1991.– 240 с.
26. Hilsen J. Inflanty.– Wilno, 1750.– 414, 57 s.
27. ГДГАМ, КП №№ 2769, 9216, 9219, 15113.
28. Лупсякова Т. Дакументы Стэфана Баторыя ў фондах музея.// Краязнаўчыя запіскі.– Гродна, 1997.– Вып.4.– С.115–126.

29. Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах – Мн.: Беларусь, 1993. – 70 с.
30. Obst J. Herbarz litewski // Kwartalnik Litewski.– Wilno, 1910.– R.1.– T.1.– S.124–127.
31. Цітоў А. Герб і пячаткі Новагродка.// Наваградскія чытанні.– Мн.: БВТ „Хата", 1996.– Вып.4.– С.32–33.
32. Цітоў А. Герб места Новагародка.// Беларуская мінуўшчына.– 1995.– № 3.– С.24–25.
33. Пякарскі А. Наваградскія гербы.// Спадчына.– 1993.– № 5.– С.2–3.
34. Diehl E. Uzupełnienie do sfragistyki polskiej.// WNA.– Kraków, 1890.– Nr 4 (6).– Słp.108–120.
35. Jabłonowski J.A. Heraldyka to jest osada kleynotów rycerskich.— Lwów, 1752.— 201 s.
36. Цітоў А. Геральдыка Беларускіх местаў.– Мн.: Полымя, 1998.– 287 с.
37. Беларускія летапісы і хронікі./ Уклад. У.Арлова; прадм. В.Чамярыцкага.– Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997.– 432 с.
38. Niesiecki K. Herbarz Polski. – Lipsk, 1839. – T.1. – 580 s.
39. Хорошкевич А.Л. Печати полоцких грамот XIV–XV в.//ВИД.– Л.: Наука, 1972.–Т.4.–С.128–146.
40. Харашкевіч Г.Л. Полацкія пячаткі XV стагоддзя.// ПГКБ.– 1974.– № 1.– С.26–30.
41. Цітоў А. Гарадская геральдыка Беларусі.– Мн.: Полымя, 1989.– 207 с.
42. Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед.– Мн.: БелСЭ, 1988.– 608 с.
43. Хорошкевич А.Л. Полоцкие грамоты XIII–начала XVI в.– М.: В 5 т., Т. 3, 1980.– 231 с.
44. Orzeł Biały: Godło państwa Polskiego / Oprac. M.Woźniakowa.– Warszawa,1995.– 68 f.
45. Тарасаў С., Мілюцін У.Помнік дробнай плястыкі з Полацка.// Полацак.– 1994.– № 5(35).–С.3–9.
46. Тарасаў С. Вялікі пасад у Полацку.// ПГКБ.– 1988.– № 4.– С.18–21.
47. Румянцева В.В. Эмблемы земель и гербы городов Левобережной Украины периода феодализма.– Киев: Наукова думка, 1986.– 126 с.

## Крыніцы па гісторыі шляхецкай сям'і XVI–XVII ст.

The article *"Sources of history of szlachta's family of the 16th-17th c."* by **Natallia Sliż** proposes the characteristic of groups of sources that illustrated the history of family. The author analyses different types of documents such as state, private documents, literature, memoirs, correspondence and others.

Дзейнасць шляхецкай сям'і Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII ст. праходзіла ў разнастайных сферах грамадства, таму захаваўся шэраг дакументаў, якія асвятляюць яе жыццё ад юрыдычных спраў да побытывых сітуацый. Аднак, на сённяшні дзень яны не сістэматызаваны і не зведзены ў адну схему. Г.Я.Галенчанкам былі прааналізаваны крыніцы па гісторыі ВКЛ.[33] Даследчык ахарактарызаваў акты і граматы, заканадаўчыя дакументы, матэрыялы бягучага справаводства і апавядальныя крыніцы. Асобна былі вылучаны гістарычныя крыніцы канца XVI–XVIII ст. Яшчэ ў беларускай гістарыяграфіі існуе агульная класіфікацыя крыніц па гісторыі Беларусі С.М.Ходзіна.[34] Характарыстыка асноўных груп дакументаў бярэцца паводле яе. Па гэтай класіфікацыі вылучаюцца два раздзелы крыніц: дакументальныя і апавядальныя. Першы тып крыніц утрымлівае даволі вялікі пералік дакументаў і з'яўляецца базавым пры даследванні гісторыі шляхецкай сям'і перыяду XVI–XVII ст. Ён мае падраздзелы – дакументы заканадаўства, актавыя дакументы, статыстычныя матэрыялы.

Да **дакументаў заканадаўства** адносяцца пастановы Гарадзельскага сойму 1413 г., прывілеі 1434 і 1457 г., Судзебнік Казімера 1468 г., Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 г.[35] Гэта асноўныя заканадаўчыя дакументы, па якіх вялося прыватнае справаводства ў ВКЛ. Яны рэгулявалі сямейна-шлюбныя дачыненні, галоўным чынам, іх маёмасны аспект. У іх вызначаліся памер вена і пасагу, парадак перадачы нерухомай маёмасці, агаворваліся правы і абавязкі кожнай асобы ў сям'і. Гэтымі дакументамі кіраваліся пры разборы сямейных спраў у Трыбунале ВКЛ, земскіх і гродскіх судах.

---

[33] Галенчанка Г.Я. Крыніцы.// ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1994.– Т.2.– С.412–422.

[34] Ходзін С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): Вучэб.дапам.– Мн., 1999.

[35] БЭФ. Сб.док-тов и мат-лов: В 3 т.– Мн.: Изд-во АН БССР, 1959.– Т.1.– С.115–126; Старостина И.П. Судебник Казимира 1468.// Древнейшие государства на территории СССР. Материалы и исследования 1988–1989 г.– М., 1991.– С.170–344; Статут Великого княжества Литовского 1529.– Мн., 1960; Archiwum Komisyi prawniczej.– Kraków, 1900.– T.7; Статут Вялікага княства Літоўскага 1588.– Мн., 1989.

Наступная катэгорыя – гэта **актавыя дакументы**. Яны фіксавалі эканамічныя ці палітычныя здзелкі, дагаворы паміж прыватнымі асобамі і дзяржавай ці паміж прыватнымі асобамі. Гэтыя крыніцы запісваліся ў Літоўскую Метрыку, кнігі Галоўнага Літоўскага Трыбуналу, земскіх і гродскіх судоў. Сярод іх вылучаюцца публічныя актавыя дакументы ўрадавага паходжання. Гэта – прывілеі (даравальныя граматы), якія вялікі князь даваў шляхце на нерухомую маёмасць, на шляхецтва і на атрыманне пасады. Такія дакументы атрымалі Іван Васільевіч Саламярэцкі, Марцін Кантанцінавіч Чыж, Іван Няміра, Леў Сямёнавіч Чыж і інш.[36]

Замацоўваючыя граматы таксама выдаваліся вялікім князем. Яны падцверджвалі здзелкі куплі-продажу, даруючыя, тэстаменты, вяноўныя запісы і іншыя прыватныя дакументы. Яны мелі шырокае распаўсюджанне прыкладна да правядзення земскай рэформы 1565–1566 г. Яе вынікам стала з'яўленне павятовых земскіх судоў, у якіх сталі актыкоўвацца прыватныя дакументы. Інструкцыі на вальныя соймы і соймавыя пастановы прызначаліся для рэгулявання ўнутранай і знешняй палітыкі, эканомікі краіны. Гэтыя дакументы надрукаваны ў Актах віленскай археаграфічнай камісіі і *"Volumina Legum"*.[37] Яны зрэдку закраналі сямейна-шлюбныя адносіны.

Пастановы Галоўнага Літоўскага Трыбуналу, земскіх і гродскіх судоў або матэрыялы бягучага справаводства[38] прадстаўляюць інтарэс як крыніцы па гісторыіі сям'і. Гэтыя ўстановы займаліся разборам прыватных спраў шляхты, звязаных з падзелам маёмасці, апякунствам, наездамі на маёнткі, забойствамі і інш. Дакументы такога кшталту даволі добра ілюструюць прыватнае жыццё шляхты і праблемы з якімі сутыкалася феадальная сям'я. Пры добрай захаванасці судовых кніг можна прасачыць гісторыю шляхецкай сям'і на працягу некалькіх пакаленняў. Частка гэтых крыніц была апублікавана Віленскай археаграфічнай камісіяй[39]. Даволі значная колькасць трыбунальскіх, земскіх і гродскіх кніг захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве ў Менску. Гэта кнігі Галоўнага Трыбуналу ВКЛ, Слонімскага земскага суду, Менскага гродскага суду, Гарадзенскага земскага суду, Берасцейскага гродскага і земскага судоў, Браслаўскага гродскага суду, Пінскага гродскага суду і інш.[40] У выніку розных прычын сямейныя архівы маглі згубіцца, аднак, дзякуючы абавязковай актыкацыі ўсіх прыватных дакументаў, яны маглі захавацца. Судовыя кнігі змяшчаюць таксама крымінальныя справы і разнастайныя правапарушэнні, якія не заўсёды мелі месца ў архіве сям'і.

Прыватнаправавыя актавыя дакументы прадстаўляюць даволі буйную групу крыніц, якая з'яўляецца асноўнай па сямейнаму справаводству. Яна да сённяшняга дня не ўведзена ў шырокі навуковы зварот. Спроба прааналізаваць гэты тып крыніц была зроблена І.І.Лапо (малодшым). Ён прапанаваў наступную класіфікацыю па пісьмовым дамовам: простыя і кваліфікаваныя публічныя здзелкі (упісваліся у гродскія і земскія суды), простыя і кваліфікаваныя хатнія здзелкі (замацаваныя пячаткай асобы, якая з'яўляецца аўтарам дакумента).[41] Але яна недасканалая і не дазваляе поўнасцю раскрыць спецыфіку дакументаў. Аўтарам прапаноўваецца характарыстыка групы крыніц, якае мае дачыненне да сямейна-шлюбных адносін.

---

[36] Метрыка Вялікага княства Літоўскага (1522–1552 г.).– Мн., 2000.– Кн.28.– С.48, 96, 104–105.
[37] АВАК. Акты Брестского гродского суда.– Вильна, 1870.– Т.3; Volumina Legum.– Petersburg, 1859–1889.– Т.1–9.
[38] Галенчанка Г.Я. Крыніцы.// ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1994.– Т.2.– С.415–416.
[39] АВАК.– Вильна, 1865–1912.– Т.1–13, 15, 21, 26, 36.
[40] НГАБ у Менску, ф.№1702, воп.1, спр.1–4, 15; ф.№ 1705, воп.1, спр.1; ф.№ 1707, воп.1, спр.17; ф.№ 1733, воп.1, спр.1–8; ф.№ 1741, воп.1, спр.1; ф.№ 1732, воп.1, спр.1; ф.№ 1755, воп.1, спр.5; ф.№ 1785, воп.1, спр.12, 14.
[41] Лаппо И.И. (младший). Листы-записы в Литовском праве XVI столетия.– Tartu–Юрьев, 1935.

**Шлюбная дамова** – гэта пагадненне паміж бацькамі жаніха і нявесты, у якім агаворвалася вена, пасаг, дата і месца шлюбу. Гэтая крыніца сустракаецца ў фамільных зборах. Аўтарам выяўлена 7 дакументаў у фондах Слізняў, Радзівілаў, Сангушкаў.[42]

**Вяноўны запіс** даваўся мужам жонцы на 1/3 сваёй маёмасці за ўнясенне пасагу. Вена было абавязковым элементам шлюбнага кантракту, таму гэты дакумент складаўся пры заключэнні кожнага шляхецкага шлюбу. Ён актыкаваўся ў кнігах гродскіх і земскіх судоў.

**Пасагавы рэестр** састаўляўся бацькамі ці апекунамі нявесты. У ім быў пералік грошаў, рэчаў, якія нявеста ўносіла ў дом мужа. Звычайна захоўваўся ў прыватных архівах.

**Квіт пра атрыманне пасагу** даваўся мужам і жонкай бацькам жонкі, што яны атрымалі ад іх пасаг і адмаўляліся ад іншай бацькоўскай маёмасці. Дакумент заносіўся ў судовыя кнігі.

Шлюбная дамова, вяноўны запіс, пасагавы рэестр, квіт зрачэння складалі пералік дакументаў неабходных для заключэння шлюбу. Яны вызначалі абавязкі двух бакоў адносна адзін аднаго. Дакументы былі асновай шлюбнага кантракту. Заканадаўства патрабавала іх актыкацыю ў судовыя кнігі.

**Даруючы запіс** – гэта дараванне нерухомай і рухомай маёмасці, які мог быць адрасаваны мужу, жонцы, дзецям, братам, сёстрам і іншым асобам. Даруючыя як і тэстаменты рэгулявалі маёмасныя дачыненні ў сям'і. Аўтарам выяўлена 79 дакументаў такога тыпу. Гэтыя крыніцы паказваюць унутрысямейныя адносіны, стаўленне сужэнцаў адзін да другога, братоў, сясцёр, сваякоў, указваюць на прычыну, якая падштурхнула зрабіць падарунак. Праз даруючыя запісы прасочваецца парадак перадачы маёмасці. У іх змяшчаецца інфармацыя, якой маёмасцю валодаў шляхціц ці шляхцянка. Гэта былі важныя дакументы ў сямейным справаводстве, таму іх абавязкова заносілі ў земскія і гродскія кнігі.

**Тэстамент** – гэта прававы акт, распараджэнне, складзенае ў вызначанай форме пра асабістую маёмасць на выпадак смерці.[43] Для даследавання шляхецкай сям'і гэта адзін з асноўных дакументаў. У ім падаваліся наступныя звесткі: зямельная маёмасць, рэзідэнцыя альбо месца сталага жыхарства, веравызнанне, месца пахавання, парадак цэрымоніі пахавання, прыкладная дата смерці, колькасць шлюбаў (зрэдку дата шлюбу), імя мужа ці жонкі, адносіны да мужа ці жонкі, колькасць дзяцей, іх выхаванне, адукацыя і шлюбы, сваякі і ўзаемаадносіны з імі, кола сяброў і пратэктараў, сувязь з дзяржаўнымі дзеячамі, месца стварэння дакумента.[44] Важнасць гэтай крыніцы ў вывучэнні гісторыі асобы і сям'і была адзначана І.Спрогісам, А.Хедэманам, У.Аўгустыняк, М.Баркоўскай, М.Александровіч-Шмулікоўскай, М.Ю.Гардзеевым.[45]

Тэстаменты захоўваюцца ў зборах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Менску і Горадні, Галоўнага Архіва Старажытных Актаў у Варшаве (AGAD), надрукаваны ў матэрыялах

---

[42] НГАБ у Менску, ф.№ 694; НГАБ у Горадні, ф.№ 1663; Archiwum XX.Sanguszków w Slawucie.– Lwów, 1910.– Т.3, 6, 7.

[43] Маслыка Г.А. Тэстамент.// Статут Вялікага княства Літоўскага 1588.– Мн., 1989.– С.563.

[44] Сліж Н., Гардзееў М. Шляхецкія тэстаменты 16–пачатку18 ст.// Гістарычны альманах.– Горадня, 2000.– Т.3.– С.90–110.

[45] АВАК.– Т.12.– С.XXIX; Augustyniak U. Testamenty ewangelików reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim.– Warszawa, 1992; Aleksandrowicz-Szmulikowska M. Radziwiłłówny w świetle swoich testamentów. Warszawa, 1995; Borkowska M. Dekret w niebeskim ferowany parlamencie.– Kraków, 1984; Hedemann O. Testamenty Brasławsko-dziśnienskie XVII–XVIII wieku jako żródło historyczne.– Wilno, 1935; Гордеев М.Ю. Формуляр записей-тестаментов в полоцких магистратских книгах 2-й пол. XVII в.// Межславянские взаимоотношения и связи: Средние века–раннее Новое время.– М., 1999.– С.38–41; яго ж: Запісы-тэстаменты полацкіх мяшчан часоў вайны 1654–1667 г. як пісьмовыя гістарычныя крыніцы.// Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы Рэсп.навук.-практ.канф., Мн., 27 сакавіка 1999 г.: У 2 ч.– Мн., 1999.– Ч.2.– С.39–42.

зборнікаў дакументаў *“Белоруссия в эпоху феодализма”*, *“Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею”*, *“Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предместьям”*, *“Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединённых с нею владений (от 1387 до 1710 года)”*, *“Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске”*, у манаграфіях У.Аўгустыняк і М.Баркоўскай. Колькасць гэтых дакументаў акрэсліць даволі цяжка. Аўтарам прааналізавана і ўведзена ў навуковы зварот каля 60 тэстаментаў.

Тэстаменты найбольш поўна раскрываюць шляхецкі менталітэт, рэлігійныя прыхільнасці, сямейную гісторыю шляхты, атмасферу і рытм тагачаснага жыцця і яго каштоўнасці. У іх падрабязна апісваецца матэрыяльны стан сям’і, адносіны ўнутры сям’і і са сваякамі. Багаты факталагічны матэрыял, які прыводзіцца ў завяшчаннях, дазваляе ўдакладніць біяграфічныя звесткі.

**Дамова пра падзел маёмасці** звычайна заключалася паміж сваякамі паводле тэстаменту памерлага іх бацькі, маці, сястры, брата і інш. Гэты дакумент абавязкова актыкаваўся ў судовыя кнігі. У ім падрабязна распісвалася каму і якая прызначалася маёмасць. Ён сустракаецца амаль у кожнай шляхецкай сям’і (Слізні, Шэметы, Радзівілы і інш.).

**Пазыковы запіс** – даўгавы абавязак, які запісваўся на пэўнай нерухомай маёмасці, з вызначэннем тэрміна яго выплаты. Пры поўнай наяўнасці сямейных дакументаў ён дазваляе выявіць сапраўдны матэрыяльны стан сям’і. Здаралася так, што сям’я валодала шматлікімі маёнткамі, але ўсе яны былі закладзены.

**Купчы запіс** – гэта дагавор пра куплю-продаж нерухомай маёмасці з падрабязным апісаннем маёнтка і прыналежнай да яго тэрыторыі і з вызначэннем яго кошту. Праз гэтыя дагаворы шляхта мела магчымасць мяняць памеры сваіх уладанняў.

**Фундацыя (фундуш)** – ахвяраванне праваслаўным, каталіцкім, пратэстанскім манастырам, цэрквам, касцёлам, шпіталям зямельных угоддзяў, грошай, каштоўнасцяў і інш.[46] Дакумент даваўся мужчынай ці жанчынай, ці мужам і жонкай разам. Фундацыя пэўнай рэлігійнай установы магла падтрымлівацца з пакалення ў пакаленне. Гэты тып дакументу меў шырокае распаўсюджанне ў вызначаны перыяд. Ён дазваляе вызначыць да якога веравызнання належала сям’я, яе стаўленне да рэлігіі, фінансавыя магчымасці ў рэлігійных ахвяраваннях. У шляхецкім грамадстве гэта лічылася добрым тонам даваць фундацыйны запіс, нават сярод самых бедных яго прадстаўнікоў. Гэты дакумент з’яўляецца паказчыкам шляхецкай рэлігійнасці. Таксама, ён – важная крыніца па гісторыі пабудовы і існавання цэркваў, касцёлаў, кляштараў, збораў.

Са **статыстычных матэрыялаў** трэба адзначыць **інвентары** шляхецкіх маёнткаў, якія ўяўляюць сабой вопісы уладанняў шляхты XVI–XVIII ст.[47] Гэтыя крыніцы добра ілюструюць шляхецкі двор як гаспадарчую адзінку. У іх ідзе апісанне дому, пералік пабудоў, фальваркаў, вёсак.[48] Гэта дазваляе прасачыць эканамічныя функцыі феадальнага маёнтку, асноўныя накірункі яго вытворчасці, памер маёнтку.

Пералічаныя публічныя і прыватнаправавыя актавыя крыніцы з’яўляюцца асноўнымі дакументамі па сямейна-шлюбнаму справаводству. Большасць з іх актыкоўвалася ў судовых кнігах. Гэта працэдура надавала ім законнасць. Яны тычыліся маёмасці, што з’ўлялася галоўным у сямейных адносінах. У іх яскрава адлюстроўваецца сацыяльна-прававы статус кожнай асобы ў шляхецкай сям’і. Захавалася іх даволі значная частка ў кнігах трыбунальскіх, земскіх і гродскіх судоў, Літоўскай Метрыцы, у

[46] Голубеў В.Ф. Фундацыя.// Статут Вялікага княства Літоўскага 1588.– Мн., 1989.– С.539–540.
[47] Казлоўскі П.Р. Інвентары.// Статут Вялікага княства Літоўскага 1588.– Мн., 1989.– С.490.
[48] АВАК.– Вильна, 1875.– Т.8.– С.411–420; АВАК.– Вильна, 1888.– Т.14; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVI–XVIII в.: Владение Сморгонь.– Мн., 1977.

фамільных фондах Радзівілаў, Быхаўцаў, Слізняў, Хмараў, Прозараў, Ельскіх, Палубінскіх і інш.[49] Частка надрукавана ў зборніках дакументаў.[50]

Дакументы напісаны на старабеларускай і польскай мовах. Справаводства ў дзяржаўных установах (дзяржаўная канцылярыя, Галоўны Трыбунал ВКЛ, земскія і гродскія суды) вялося на старабеларускай мове. У судовыя кнігі дакументы актыкоўваліся на мове арыгінала. Да пачатку XVII ст. гэта была старабеларуская мова, а потым – польская. На ўсходніх тэрыторыях ВКЛ у прыватным справаводстве старабеларуская мова ўжывалася даўжэй. Аднак, варта адзначыць, што польская мова ВКЛ адрознівалася ад польскай мовы, якой карысталіся на тэрыторыі Польшчы. Яна захавала шмат слоў, зваротаў са старабеларускай мовы.

З раздзела дакументальныя крыніцы вылучаюцца прыватнаправавыя дакументы. Кожная шляхецкая сям'я мела свой уласны архіў, дзе захоўваліся падобныя матэрыялы. Звычайна яны рабіліся ў некалькіх экзэмплярах. Напрыклад, калі гэта быў фундацыйны запіс, то адзін дакумент заставаўся ў фундатара, другі ішоў рэлігійнай ўстанове, а трэці актыкаваўся ў судовыя кнігі.

Падбор вышэй прыведзеных дакументаў па гісторыі пэўнай шляхецкай сям'і дае багаты факталагічны матэрыял, паводле якога можна вызначыць матэрыяльны стан сям'і, яе сацыяльны і палітычны статус, асноўныя падзеі ў сям'і і асобы, скласці генеалагічнае дрэва, ахарактарызаваць некаторыя аспекты ўзаемаадносін у сям'і паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі, месца і ролю асобы ў залежнасці ад яе пола і ўзросту.

Раздзел апавядальныя крыніцы ўтрымлівае: летапісы, хронікі, мемуарную літаратуру, эпісталярныя крыніцы, літаратурна-публіцыстычныя творы. У адрозненне ад папярэдняй групы гэтыя крыніцы часта носяць асабісты характар, паказваюць уласнае стаўленне аўтара да той ці іншай падзеі, ідэалы шляхецкага грамадства.

Пры апісанні падзей у дзяржаве **летапісы** і **хронікі** не абміналі прыватнае жыццё шляхты. Узор сапраўднага шляхціца і ваяра апісваецца ў *"Пахвале князю Канстанціну Іванавічу Астрожскаму"*. У *"Аповесці пра Жыгімонта Аўгуста і Барбару Радзівіл"* распавядаецца адна з самых рамантычных гісторый кахання XVI ст. *"Баркулабаўскі летапіс"* утрымлівае інфармацыю пра сем'і Баркулаба Корсака і яго зяця Багдана Іванавіча Саламярэцкага.[51]

Да **мемуарнай літаратуры** адносяцца ўспаміны, дзённікі, запісы падарожжаў, сямейныя хронікі. У шляхецкім асяроддзі яны з'яўляюцца ў XVI ст. і набываюць распаўсюджанне ў XVII ст. Даволі цікавымі і інфарматыўнымі з'яўляюцца мемуары Фёдара Еўлашоўскага, Яна Цадроўскага, Альбрэхта Станіслава Радзівіла, Багуслава Радзівіла, дзённікі Станіслава Незабытоўскага, запісы падарожжаў Тэадора Білевіча, Бернарда О'Конара, Эніяса Сільвіюса, сямейная хроніка Уніхоўскіх[52]. У іх змяшчаюцца побытавыя замалёўкі, падзеі з сямейнага жыцця (заручыны, вяселле, народзіны і інш.), а таксама стаўленне аўтара да сваіх родных. У творах, аўтарамі якіх была шляхта,

[49] НГАБ у Менску, ф.№ 694, 1324; НГАБ у Горадні, ф.№ 1663, 1664; Archiwum Główny Akt Dawnych, Archiwum X.Radziwiłłów, Archiwum Prozorów i Jelskich.

[50] Собрание государственных и частных актов, касающихся истории и соединённых с ней владений (от 1387 до 1710 года), изданное Виленскою археографическою комиссиею по редакцией Маврикия Круповича.– Вильно, 1858; Собрание древних грамот и актов городов: Вильно, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам.– Вильна, 1843.– Ч.2; АВАК.– Вильна, 1865–1912.– Т.1–5, 7–8, 10–15, 21, 26, 33–34; ИЮМ.– Витебск, 1876–1879.– Вып. 6–7, 9–10 і інш.

[51] Беларускія летапісы і хронікі.– Мн., 1997; Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст.– Мн., 1983.

[52] Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст.– Мн., 1983; Radziwiłł A.S. Pamiętnik o dziejach w Polsce.– Warszawa, 1980.– T.1–4; Radziwiłł B. Autabiografia./ Oprac.T.Wasilewski.– Warszawa, 1979; Niezabytowski S. Dzienniki 1695–1700./ Oprac. A.Sajkowski.– Poznań, 1998; Niemcewicz J.U. Zbior pamiętników historycznych o dawnej Polsce.– Warszawa, 1822.– T.1–4; Білевіч Т. Дзённік, пісаны ў Англіі пра тое, як там вандравалася і жылося.// Кніга жыцій і хаджэнняў.– Мн.: Мастацкая літаратура, 1994.– С.448–475; Кіпель З. Беларуская мова як культурна-сацыялагічны фактар (на прыкладзе адной сямейнай хронікі XVI ст.// Беларусіка– Albaruthenica.– Мн., 1994.– Кн.3.– С.177–182.

пераважае інфармацыя пра адносіны да пэўных падзей, пытанняў з пункту гледжання шляхецкага саслоўя.

**Эпісталярныя крыніцы** таксама раскрываюць унутрысямейныя адносіны, стаўленне да сямейных праблем. Яны адлюстроўваюць грамадскае, сацыяльнае, палітычнае і эканамічнае жыццё шляхты. Частка гэтых дакументаў надрукавана ў зборніках і манаграфіях[53], але асноўная іх частка знаходзіцца ў фамільных фондах НГАБ у Менску і Горадні, Галоўнага Архіва Старажытных Актаў (AGAD) у Варшаве.

**Літаратурна-публіцыстычныя творы** XVI–XVIII ст. насілі рэлігійны характар. Іх аўтары закраналі ў той ці іншай ступені праблемы звязаныя з сям’ёй, шлюбам, дзецьмі, статусам жанчыны. Сярод гэтых крыніц варта вылучыць прадмовы Ф.Скарыны, творы Б.Граіцкага, Б.Жаладкевіча, Б.Буднага, К.Аверкі, Я.Пратасовіча. Асобнае месца займае *“Прадмова Мялешкі”*, у якой змешчаны яскравыя побытавыя замалёўкі XVI ст.[54]

Асобную групу прадстаўляюць **панігірыкі** ці **пахавальныя казанні**. Яны чыталіся на цэрымоніі пахавання. Шляхецкая сям’я заказвала напісанне гэтага твору ксяндзам. У ім адлюстроўвалася жыццё нябожчыка, падрэсліваліся яго лепшыя рысы характару, усхваляліся яго ўчынкі, подзвігі, дасягненні. Пахавальныя казанні з’яўляюцца адной з найцікавейшых крыніц, якія раскрываюць мужчынскія і жаночыя ідэалы шляхецкага грамадства XVI–XVII ст. Захаваліся панігірыкі, прысвечаныя гетману ВКЛ Яну Каралю Хадкевічу, жонцы слонімскага маршалка Пятра Тышкевіча Ганне Кандзераўскай, жонцы смаленскага падкаморыя Антонія Храпавіцкага Тэрэзе Петранэлі з Валадковічаў, віленскаму кашталяну Альбрэхту Уладзіславу Радзівілу і іншым асобам.[55]

Апавядальныя крыніцы вызначаюцца літаратурным і апісальніцкім характарам. Іх аўтары не заўсёды прыводзяць дакладныя факты. Яны вельмі суб’ектыўна ставяцца да падзей, якія апісваюць. Аднак гэта і робіць іх каштоўнымі пры даследванні гісторыі шляхецкай сям’і. У адрозненні ад афіцыйнага дакумента тут можна пабачыць сапраўднае стаўленне асобы да яе сям’і і асяроддзя. Мемуары і асабістая перапіска адлюстроўваюць радасць, гора, спачуванне і іншыя эмоцыі. Гэта ў некаторай ступені дазваляе рэканструіраваць сямейнае жыццё шляхты, выявіць традыцыі, зразумець культуру ўзаемаадносін у сям’і, унутраную градацыю.

У літаратуры і публіцыстыцы як у люстэрку бачна стаўленне грамадства і рэлігіі да сям’і і шлюбу, іх уплыў на фармаванне ідэалаў у шляхецкім саслоўі. Яны прапагандуюць тыя рысы характару, якія хацелі назіраць у шляхціца і шляхцянкі. Літаратурныя творы таксама не пазбаўлены суб’ектывізму. За агульнымі тэндэнцыямі і назіраннямі прасочваецца ўласнае стаўленне аўтара да тых праблем, якія ён асвятляе.

Атрымліваецца, што калі дакументальныя крыніцы адлюстроўвалі матэрыяльны бок жыцця шляхецкай сям’і, то апавядальныя крыніцы засяроджвалі больш увагі на духоўным і культурным жыцці шляхты. Пры даследванні гісторыі шляхецкай сям’і неабходна выкарыстоўваць два тыпы крыніц, бо яны ўзаемадапаўняюць адзін аднаго і робяць уяўленне пра шляхецкую сям’ю больш поўным.

---

[53] Archiwum domu Radziwiłłów.– Kraków, 1885.– T.VIII; D’Arquien de la Grande M.K. Listy do Jana Sobieskiego.– Warszawa, 1966; Sajkowski A. Staropolska Miłość. Z dawnych listów i pamiętników.– Poznań, 1981 і інш.

[54] Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед.– Мн., 1988.– С.7–216; Groicki B. Obrona sierot y wdow, opiekunom i kuratorom.– Kraków, 1605; Załadkiewicz B. Kazanie o sakramencie małżeńskim.– Kalisz, 1781.– T.1; Budny B. Apophtemata. Owe krótkich o węzławatych opowiesci, które po grecki żonę.– Kraków, 1635; Awedyk K. Kazanie w niektorych materialach tego politycznego i uczeńszego wieku wiele potrzebnych.– Lwow, 1757; Protasowicz J. Paranymphus.– Wilna, 1595; АЮЗР.– СПб, 1865.– Т.2. (1599–1637).– С.188–190.

[55] Birkowski F. Jan Karol Chodkiewicz y Jan woyner, wielmożni waleczni, pobożni wojwodowie, pamięcią pogrzebna.– Kraków, 1627; Tytuł życia i śmierci Welmożnej JM Pani Terezy Petronely z Wołłodkiewiczow Chrapowickiej, podkomoryni smolenskiej.– Vilna, 1745 і інш.

Амаль усе пералічаныя крыніцы, акрамя заканадаўчых, летапісных і літаратурна-публіцыстычных, адносяцца да друкаваных і недрукаваных крыніц, таму аўтарам гэтыя дзве катэгорыі не вылучаліся асобна.

*Наталля Сліж*

# Матэрыялы да генеалогіі роду Міцкевічаў у XVII–XIX ст.

The article *"Materials of genealogy of the clan Mickievicz in the 17th –19th c."* is based on archive materials. **Alaxiej Szałanda** considers origin and history of the Mickievicz from Aszmiana region. This branch was descended from Goradnia region. The representatives of Mickieviczes purchased estates Pażyżma, Naviany-Shafranauszczyzna, Daugiały (Lida region) in the end of the 17th – at the beginning of the 19th c.

У НГАБ у Горадні захоўваецца *"Справа аб паходжанні шляхецкага роду Міцкевічаў"*, якая была распачата ў 1852, а закончана – у 1860 г. [1]. Праглядаючы яе, мы звярнулі ўвагу на шэраг аўтэнтычных дакументаў другой паловы XVII–XVIII ст., якія былі прыкладзены да судовых матэрыялаў XIX ст. Гэта былі:

1. Ліст Адама Мацея Саковіча, ваяводы Смаленскага, адміністратара Скарбу ВКЛ, старосты Ашмянскага і дзяржаўцы Якунскага ад 13.07.1661 г.;
2. Рэляцыйны ліст Юрыя Янкоўскага, вознага ЯКМ Ашмянскага павету ад 19.06.1701 г.;
3. Тэстамент Мацея Міцкевіча ад 05.03.1746 г.;
4. Прадажны ліст Юрыя, Тамаша і Міхала Міцкевічаў ад 23.04.1787 г.

Згаданыя дакументы і іншыя матэрыялы *"Справы"* дазваляюць скласці радавод галіны Міцкевічаў, якія аселі ў Ашмянскім павеце ВКЛ, а таксама прасачыць іх лёс і вызначыць маёнткі.

Як вынікае з лісту Адама Мацея Саковіча, першым прадстаўніком ашмянскіх Міцкевічаў быў **Юры**, лоўчы Гарадзенскі і скарбовы дваранін. Менавіта ў якасці апошняга, ён у 1661 г. павінен быў выехаць ў маёнтак Гарасімовічы Гарадзенскага павета каб, паводле прывілею караля і вялікага князя Яна Казімера Вазы, перадаць яго ў валоданне Зыгмунту Валу, палкоўніку і дваранін пакаёваму ЯКМ і яго жонцы Кацярыне з Хохаштэрберкаў [1, а.1]. Сам Юры, які паходзіў з гарадзенскіх Міцкевічаў, аб чым ускосна сведчыць яго тытул, у другой палове XVII ст. перасяліўся ў Ашмянскі павет, дзе яму належаў маёнтак Пажыжма. Гэта, як і тое, што ён памёр каля 1701 г., вынікае з рэляцыі вознага Ю.Янкоўскага. З яе мы даведваемся таксама, што Юры меў сына **Крыштафа**, які і атрымаў пасля смерці бацькі згаданую Пажыжму ў спадчыну [1, а.3].

Сынам Крыштафа Юр'евіча Міцкевіча быў **Мацей**, які гэта засведчыў ва ўласным тэстаменце. Згаданых там сваіх нашчадкаў Мацей прасіў каб пахавалі яго *"...na cmętarzu parafialnym przy kosciole*[56] *obrzędkiem katolickim..."* [1, а.6]. З невядомай жонкай ён меў трое дзяцей: два сыны – **Ваўжынца (Лаўрына)** і **Казімера** і дачку **Ганну**. Пажыжму бацька падзяліў паміж сынамі на две роўныя часткі, а дачку, даўшы пасаг, выдаў замуж за нейкага Яноўскага. Апошняй ён яшчэ запісаў усё сталовае срэбра і бялізну [1, а.6].

Як вынікае з прадажнага лісту родных братоў **Юрыя**, **Тамаша** і **Міхала** Міцкевічаў, у 1787 г. Ваўжынец Мацеявіч Міцкевіч купіў у іх за 10000 польскіх злотых палову маёнтка Пажыжма. Улічваючы тое, што тры вышэй згаданыя браты называлі Ваўжынца сваім стрыем, а Мацея – дзедам, былі яны сынамі Казімера Мацеявіча [1, а.7–7 адв.]. Відавочна, што купленая Ваўжынцам палова Пажыжмы была той часткай, якая дасталася яго брату пры падзеле бацькам маёнтку. Акрамя гэтага, у 1797 г. Ваўжынец узяў у Бенедыкта Качана ў заставу за 188 чырвоных злотых і 16 злотых (з разліку 1 чырвоны злоты – 3 рублі срэбрам) палову маёнтку Навяны-Шафранаўшчызна, а ў 1800 г. атрымаў яе ў спадчыннае валоданне [1, а.19]. Яго сынамі былі **Павел** і **Казімер**, якія не пакінулі нашчадкаў [1, а.45].

---

[56] Відаць, маецца на ўвазе Воранаўскі касцёл, бо Пажыжма ўваходзіла ў склад Воранаўскай рымска-каталіцкай парафіі [2, s.15].

Юры і Тамаш Казімеравічы таксама памерлі без нашчадкаў [1, а.94]. Толькі іх брат Міхал (1770–1860) з жонкай Крыстынай Пятроўскай меў чатырох сыноў: **Казімера-Міхала**, **Юрыя (Георгія)-Антона**, **Аляксандра**, **Юзафа (Восіпа)** і трох дачок: **Людвіку**, **Юзафату** і **Францішку** [1, а.23, 114]. Казімер-Міхал жыў разам з бацькам, а Юры-Антон з сынам **Феліцыянам**, Аляксандр і Юзаф – у Вільні і Ашмянскім павеце. У 1832 г. Міхал Казімеравіч разам са сваёй жонкай купіў у нейкага Даўгялы за 1000 расійскіх асігнацыяў фальварак Даўгялы Лідскага павету [1, а.17].[57]




У 1839 г. яго старэйшы сын Казімер-Міхал распачаў справу па доказу свайго шляхецтва. У *"Пасведчанні"*, якое яму было выдана 02.03.1839 г. Лідскім павятовым судом, адзначалася, што Міцкевічы *"...по дворянским же спискам [1816] и [1827] годов состоят записанными, а имянно в первых: Михаил Казимиров сын с сыновьями Казимиром, Антоном и Александром, а в последних на 51 листе* ***Павел Францев*** *сын*[58] *и на 53 листе Михаил с сыновьями Казимиром, Антоном, Александром и Иосифом Мицкевичи..."* [1, а.23–23 адв.]. Далей паведамлялася, што ў апошнім 1834 г. перапісу насельніцтва згаданыя Міхал Казімеравіч з сынамі і Павел Францавіч Міцкевічы *"...состоят записанными в книге дворян здешняго [Лидскаго] уезда второго разряда под добавочным № 35-м на основании определения бывшего Литовского Дворянского Депутатского Собрания в [20.05.1800 г.] состоявшегося, и подушному окладу не принадлежали и не принадлежат..."* [1, а.23 адв.–24]. Аднак, негледзячы нават на сведчанне маршалка лідскай шляхты П.Путкамера ад 19.01.1847 г. аб тым, што *"...род Мицкевичей, пользуясь из предков преимуществами Дворянства по ревизиям 1795, 1811, 1816, 1827 и 1834 годов подушному окладу не подвергался, вёл завсегда образ жизни приличный благородному званию и не был лишён прав Дворянства силою закона, и что сей же род Мицкевичей, находясь в бедном состоянии не имеет средств к представлению на гербовой бумаге переводов из Департаментов о дворянском своём происхождении..."* [1, а.24–24 адв.], справа аб прызнанні Міцкевічаў шляхтай зацягнулася да 1863 г. ды так і не была закончана [1, а.46].

---

[57] Не мае рацыі Міхал Шымялевіч, калі адносіць Міцкевічаў у Даўгялах да іншага роду. Пра іх ён піша, што яны належалі да Міцкевічаў з Жалобішак, Ганскевічаў і Повараў, былі прызнаныя шляхтай Літоўска-Віленскай Дэпутацыяй 26.05.1800 г., але пазней іх запісалі ў аднадворцы. Толькі сем чалавек з гэтага роду дамагліся зацверджання ў шляхецтве 15.03.–18.04.1862 г. [2, s.14].

[58] Францішак – верагодна, другое імя Ваўжынца.

Паводле М.Шымялевіча, Міцкевічы з Пажыжмы былі прызнаныя шляхтай Літоўска-Віленскай Дэпутацыяй яшчэ 08.04.1798 г., аднак, указу Герольдыі, які б зацвердзіў іх у шляхецтве, ён не знайшоў [2, s.14]. Відаць не было яго зусім, бо як вынікае са *"Справы"*, значна яе ўскладніла падача Міцкевічамі падложных дакументаў. Калі ў 1839 г. Казімер-Міхал Міцкевіч прадставіў у Віленскі шляхецкі дэпутацкі сход наступныя паперы: *"...купчую крепость на Им: Пожижму 1560*[59]*, Января 3, продажную сделку на это имение 1752, Января 25 и духовное завещание 1781 г[ода], Марта 5..."* [1, а.88], высвятлілася, што іх падрабіў вядомы фальсіфікатар дакументаў Фабіян Шукевіч, а таму яны былі знішчаны. У сувязі з гэтым, Казімеру-Міхалу Міцкевічу прыйшлося падаваць у 1847 г. новыя вышэй згаданыя дакументы, якія былі прызнаны Ашмянскім павятовым судом сапраўднымі толькі ў 1856–1859 г. [1, а.45, 88 адв., 114, 124]. Аднак, на наступныя судовыя паседжанні ў 1863 г. ніхто з Міцкевічаў не з'явіўся [1, а.46 адв.–47].

Такім чынам, матэрыялы *"Справы"* значна дапаўняюць веды [3; 4, с.82–83] аб разгалінаваннях беларускага шляхецкага роду Міцкевічаў, да якога належаў славуты польскі паэт.

*Аляксей Шаланда*

**Літаратура і крыніцы:**


1. НГАБ у Горадні, ф.№ 585, воп.3, спр.99.
2. Szymielewicz M. Skąd pochodzi ród Adama Mickiewicza?// Magazyn Polski.– Grodno, 1993.– Nr 1/2.– S.12–16.
3. Грыцкевіч А. Беларускія карані радаводу Міцкевічаў.// Спадчына.– 1999.– № 2.– С.143–162.
4. Малы гербоўнік Наваградзкай шляхты./ Склад. С.А.Рыбчонак.– Мн.: БелНДІДАС, 1997.–161 с.


## ***КРЫНІЦЫ***

## Кавалак "Дыярыушу" XVII ст. Грыгора Мірскага, стражніка Вялікага княства Літоўскага.

У фондах ГДГАМ захоўваецца даволі цікавы зборнік з матэрыяламі, якія датычаць маёнткаў Грозаў, Бялевічы, Прусы, Вяйсея і двара ў Слуцку [1]. Ён уяўляе сабой сшытак *in folio* з вокладкай з тоўстага кардону сіняга колеру. Тытульны ліст адсутнічае, старонкі пранумараваныя з 1 па 302. Мяркуючы па штампах на другім баку вокладкі (прыкладзены 2 разы) і на старонцы 1 (прыкладзены раз), у ГДГАМ зборнік трапіў яшчэ да вайны з менскага Беларускага Дзяржаўнага Музею[60]. Акрамя іх маюцца на 1 і 17 старонках старыя чатырохвугольныя штампы ГДГАМ з надпісам: *"Гродненский Обл. Музей. / Фонд № 29053"* і на старонках 292, 298, 300, 302 авальныя штампы Аддзела рэдкай кнігі: *"Рэдкая кніга / № 07726 / ГДГАМ"*. Папера мае вадзяныя знакі: вершніка і паляўнічы ражок.[61]

Структура зборніка выглядае наступным чынам:

1. Справы на маёнтак Грозаўскі……………………………………………с.1–139;
2. Справы на двор, дом і шпіхлер у Слуцку…………………………с.157–164;[62]
3. Справы на маёнтак Бялевіцкі……………………………………………с.165–234;[63]
4. Справы на Прусы………………………………………………………с.239–244;[64]
5. Справы застаўныя і дажывотныя на Вяйсею…..……………………с.247–256;[65]

---

[59] Далей у дакументах падаецца іншая дата – 1660 г., што сведчыць аб памылцы, зробленай тут.
[60] Штамп рамбавідны шасцівугольны, з надпісам у тры радкі: "Беларускі Дзяржаўны / №____ / Музэй". Нумару няма.
[61] У каталогу Э.Лаўцявічуса такога вершніка няма, а ражок падобны як пад № 2951. Такая папера была ў шырокім ужытку ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVII–XVIII ст. [2, s.415; 3, c.133].
[62] Старонкі 140–156 чыстыя.
[63] Старонкі 235–238 чыстыя.
[64] Старонкі 245–246 чыстыя.

6. Рэестр спраў маёнтку Грозаўскага……………………………………с.281–285;[66]
7. [Рэестр] спраў на двор і шпіхлер у Слуцку…………………………..с.287;
8. [Рэестр] спраў застаўных і дажывотных на Бялевічы……………….с.288–290;
9. [Рэестр] спраў застаўных і дажывотных на маёнтак Прусы
і Вяйсею………………………………………………………………..с.291–292.[67]

Матэрыялы, якія змешчаны ў зборніку, уяўляюць сабой копіі або нават копіі з копій розных дакументаў з 1551 па 1697 г.: прывілеі вялікіх князёў літоўскіх на згаданыя землі і маёнткі, застаўныя і купчыя лісты, выпісы з земскіх і гродскіх кніг, інвентары, тэстаменты і інш. Па палеаграфічных асаблівасцях відаць, што сборнік быў складзены пераважна ў канцы XVII ст. Аднак, запісы рабіліся і пазней – у 1791, 1823 і 1842 г. Копіі зроблены на мове арыгінала (старабеларуская, польская), толькі ў дакументах на старабеларускай мове кірыліца зменена на лацінку. Найбольш верагоднае месца стварэння зборніка – Наваградскае ваяводства ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Зборнік з’яўляецца своеасаблівай хронікай Грозава, Бялевічаў, Прусаў, Вяйсеі і Слуцкага двара, якія з сярэдзіны XVI па першую палову XIX ст., пераходзілі ад аднаго шляхецкага роду да другога, часта звязаных сямейнымі сувязямі. Па Грозава прасочваецца такі ланцужок:Валадковічы, Сасноўскія, Рагоўскія, *Незабытоўскія*, па Слуцкаму двару: князі Алелькавічы Слуцкія, Мірскія, *Незабытоўскія*, па Бялевічам: князі Радзівілы, Градоўскія, Сулятыцкія, Саўговічы, Мірскія, Капашчэўскія, Пакашы, *Незабытоўскія*, па Прусам: князі Радзівілы, *Незабытоўскія* і па Вяйсеі: князі Радзівілы, Бучыньскія, *Незабытоўскія*, дэ Раэс. Частае паўтарэнне ў матэрыялах прозвішча Незабытоўскіх, дазваляе думаць, што арыгіналы дакументаў паходзілі з архіву менавіта гэтага роду, а сам зборнік складзены яго прадстаўнікамі (сярод якіх быў Станіслаў Незабытоўскі[68]) для сваіх нейкіх патрэб, магчыма, з мэтай доказу сваіх правоў на згаданыя маёнткі і землі або як страхавачны фонд аўтэнтычных дакументаў. Нейкая частка архіву Незабытоўскіх захоўваецца сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве ў фондзе Радзівілаў [4, с.267].

Сярод матэрыялаў зборніку нашу ўвагу прыцягнуў на старонках 233–234 *“Выпіс з рукапісу г[однай] п[амяці] Я[го] м[іласці] Пана Мірскага Стражніка В[ялікаг]а К[нятв]а Літ[оўскаг]а”,* які з’яўляецца кавалкам “Дыярыушу” Грыгора Мірскага – асобы даволі вядомай у беларускай гісторыі [5, s.346–348; 6, с.210]. Фрагмент, які мы падаем ніжэй у арыгінале і ў адаптаваным перакладзе на беларускую мову, негледзячы на сваю сціслацсь, дае шмат інфармацыі аб жыцці гэтага чалавека (які заслугоўвае асобнай манаграфіі) і яго сям’і. На жаль, нам невядома дзе сёння захоўваецца ўвесь рукапіс дзённіка Г.Мірскага і ці захаваўся ён навогул. У апошнім выпадку, каштоўнасць дайшоўшага да нас кавалку значна ўзрастае. Разам з тым, ён яшчэ раз сведчыць наколькі быў папулярны ў другой палове XVI–XVII ст. сярод адукаванай шляхты ВКЛ і Рэчы Паспалітай падобны жанр.[69]

Дакумент друкуецца з захаваннем усіх асаблівасцяў арыгінальнага тэксту. Загаловак і лацінізмы вылучаны курсівам.

## s.233 ***Przepis z rękopisu g.[odnej] p.[amięci] J[ego] m[iłości] Pana Mirskiego Strażnika W[ielkieg]o X[ięstw]a Litt[ewskieg]o.***

---

[65] Старонкі 257–280 чыстыя.
[66] Старонка 286 чыстая.
[67] Старонкі 293–302 чыстыя.
[68] Станіслаў Ян Незабытоўскі (1641–1717) – вядомы мемуарыст [4, с.267]. Жанаты быў на адной з дачок Грыгора Мірскага, стражніка ВКЛ [5, s.348].
[69] Акрамя *“Выпісу…”* у зборніку ёсць яшчэ шэраг матэрыялаў, якія маюць дачыненне да роду Мірскіх. Сярод розных квітацыйных запісаў, прадажных і застаўных лістоў, кансэнсаў, найбольш цікавымі з’яўляюцца тэстаменты: Юрыя Капашчэўскага, стольніка Менскага і цесця Г.Мірскага ад 04.01.1625 г., самога Г.Мірскага ад 11.03.1661 г. і яго жонкі Кацярыны Мірскай, дачкі Ю.Капашчэўскага ад 23.04.1678 г.

Powyiśćiu moim z Tureckiego Więżienia po dwa razy; Pierszy raz z Konstantynopola, gdiem się dostał w Więżienie, będąc w Wołosiech w zaćiagu z X[ię]ciem Samuelem Koreckim, kiedysmy osadzali na Hospodarstwie Wołoskim Alexandra Mohyłę: A drugi raz z P.[anem] Strusem Starostą Halickim, kiedys my z Woyskiem Krola Je[g]o M[iłoś]ci y z Hetmanami obiema na Cecorze byli; Tam w ostatniey potrzebie podał mię Pan Bog w ręce Tatarskie, ktorzy mię zaprzedali do Białogrodu nad Dniestrem Turczynowi Machmet Durnasu: Ztamtąd mię Dobrodziey J[ego]m[iłość] Pan Ociec moy wykupił w Roku 1622. dawszy za mnie Pięćset Talerow złotowych, y parę koni.

Wyszedszy z Więżienia, byłem Posłem na Seym Roku 1622. Tam mi Krol Pan moy za *consensem* R[zeczy]p[o]s[poli]tey dał w nagrodzie zł[otych] 1500. Tamże na Seymie do X[ię]cia J[ego]m[iłoś]C[i] Krzysztofa Radziwiła Hetmana Polnego Litt[ewskieg]o rękodaynie przystałem w Warszawie *in Martio A[nn]o*: 1622.

W Roku 1624. *Nouembr[is] d[i]e* 9 w Słucku ożeniłemsię z Panną Katarzyną Kapaszczewską corką J[ego]m[iłości] Pana Jerzego Kapaszczewskiego stolnika Mińskiego.

W tymże roku wiodłem Chorągiew X[ię]cia Je[g]o M[iłoś]ci Usarską do Jnflant, kiedysmy na odsiecz chodzili Birżom y innym Zamkom w Kurlandiey.

W Roku 1625. *Septembr.[is] d[i]e* 11 dał Nam Pan Bog Corkę w niebytnośći moiey (kiedym był z X[ię]ciem Je[g]o M[iłoś]cią w expeditiey Jnflańtskiey) w Branczycach i dane iey Jmie na Chrzćie Regina Theophila.

W Roku 1626. *Augusta d[i]e* 28 w Branczycach. Vrodził mi się Syn, ktoremu na Chrzćie dano Jmie Hieronym.

W Roku 1628. *January d[i]e* 1. Urodziła mi się Corka, ktorey dano na Chrzcie Jmie Anna.

W Roku 1629. *Maia d[i]e* 17 w Branczycach. Urodziła mi się Corka, dano iey na Chrzcie S.[więtym] Jmie Katarzyna.

W Roku 1630. *Septembr.[is] d[i]e* 1 w Koydanowie. Urodziła się Nam Corka, ktorey na Chrzcie S.[więtym] dano Jmie Halszka. Ta nie doszedszy zpełna roku umarła, pochowalismy ią we Zborze Koydanowskim Roku 1631. *Augusti d[i]e* 10.

W Roku 1632. Obrano mię Deputatem z Powiatu Brasławskiego z Bratem moim J[iego]m[iłoś]c[ią] Panem Jerzym Masalskim na Sądy Głowne Trybunalne, ktore zasiadszy według Prawa y przy-

s.234 sięgę wykonawszy, sądzilismy Niedziel dwie: Ale Nas z Koła ruszyła smierć Krola Pana Naszego Zygmunta IIIo, ktory umarł Roku 1632. *April.[is] d[i]e* 29.

W tymże Roku 1632. *May d[i]e* 8. Wyiechałem z Wilna dla zaciągu, ktory na mię X[ią]że J[iego]m[iłoś]c Pan Hetman włożył, dawszy mi list Przypowiedny na sto koni Vsarza, y śćiągnienie w Mińsku.

Tegoż Roku 1632. *Junii d[i]e* 24. Urodził mi się Syn: Dano mu Jmie na Chrzcie S.[więtym] Jan.

Tegoż Roku 1632. *July d[i]e* 7. J[iego]m[iłość] Pan Lew Sapieha Woiewoda Wilenski Hetman W.[ielki]Litt.[ewski] umarł w Rożaney i pogrzebiony w Berezie *d[i]e* 21. *July*. 1632.

W Roku 1633. *in Martio* w Obozie na Krasnym dał mi X[ią]że Je[g]o M[iłoś]ć Przypowiedny List od Krola Je[go] M[iłoś]ci na 120 koni Vsarza, y tegoż Mięsiąca wyiechałem z Obozu dla *supplementu* do tey Chorągwie moiey.

W Roku 1638. *Februar.[is] d[i]e* 10. Urodziła mi się Coreczka: Na Chrzcie S.[więtym] dane iey Jmie Zofia Połonia: Kumami P.[an] Samuel Jundził y P.[an] Karmanowski: Kumy Pani Goleiewską, Pani Kamieńska y Coreczka Nasza Panna Regina.

Roku 1639. *Augusti d[i]e* 18. Urodziła się Nam Dżiewczyna, ktorey na Chrzcie S.[więtym] dano Jmie Barbara……………………*denata Roku 1715 April.[is] d[i]e 25.*[70]

[70] Дапісана пазней і іншай рукой.

**Roku 1640. *Julii d[i]e* 15. w Wilnie złomałem nogę.**

**Tegoż Roku 1640. *Septembr.[is] d[i]e* 19. w Swiadośći X[ią]że Je[g]o M[iłoś]c Pan Krzysztof Radziwił Woiewoda Wileński Dobrodziey moy zszedł z tego Swiata.**

**Tegoż roku 1640. *Octobr.[is] d[i]e* 16. w Brańczycach Małżonkę moię z brzemieńia Pan Bog uwolnił, y dał Nam Corkę: Dano iey Jmie na Chrzcie S.[więtym] Helena: Ta kilka Miesięcy żyiąc, Panu Bogu Ducha oddała.**

**Roku 1641. *Nouembr.[is] d[i]e.* 5. Rozwiązał Pan Bog Małżonkę moię y dał Nam Coreczkę: Dano iey Jmie na Chrzcie S.[więtym] Leonora Krystyna.**

[ГДГАМ, КП № 29053/07726, с.233–234].

## *Выпіс з рукапісу годнай памяці Яго міласці Пана Грыгора Мірскага, стражніка Вялікага Княства Літоўскага.*

Па маім выхадзе з турэцкай турмы, дзе я быў двойчы: першы раз – з Канстанцінопаля, куды трапіў у турму, будучы ў Валахах у выправе з князем **Самуэлем Карэцкім**, калі мы саджалі на Гаспадарстве Валашскім **Аляксандра Магілу**, а другі раз – з панам **Струсем**, старостай Галіцкім, калі мы з войскам Караля Яго Міласці і з гетманамі абодвума на Цэцоры былі. Там, у апошнім баі даў мяне Пан Бог у татарскія рукі, якія прадалі мяне ў Белгарад над Днястром турку **Махмет Дурнасу**. Адтуль мяне дабрадзей Яго міласць пан Бацька мой выкупіў у 1622 годзе, даўшы за мяне 500 талераў і пару коней.

Выйшаўшы з турмы, быў паслом на сойм 1622 года. Там мне Кароль Пан мой за кансэнсам Рэчы Паспалітай даў у нагараду 1500 злотых. Там жа на сойме да князя Яго міласці **Крыштафа Радзівіла**, гетмана польнага літоўскага, далучыўся ў Варшаве, у сакавіку 1622 г.

У 1624 годзе 9 лістапада ў Слуцку ажаніўся з паннай **Кацярынай Капашчэўскай**, дачкой Яго міласці пана **Юрыя Капашчэўскага**, стольніка Менскага. У тым жа годзе вадзіў харугву князя Яго міласці [Радзівіла] гусарскую ў Інфлянты, калі мы на адсеч хадзілі Біржам і іншым замкам у Курляндыі.

У 1625 годзе 11 верасня даў нам Пан Бог дачку ў небытнасць маю (калі быў з князем Яго міласцю [Радзівілам] у экспедыцыі Інфлянцкай) у Бранчыцах і далі ёй імя пры хрышчэнні **Рэгіна Тэафіла**.

У 1626 годзе 28 жніўня ў Бранчыцах нарадзіўся мне сын, якому пры хрышчэнні далі імя **Геранім**.

У 1628 годзе 1 студзеня  нарадзілася мне дачка, якой далі пры хрышчэнні імя **Ганна**.

У 1629 годзе 17 мая ў Бранчыцах нарадзілася мне дачка, далі ёй пры Святым хрышчэнні імя **Кацярына**.

У 1630 годзе 1 верасня ў Койданаве нарадзілася нам дачка, якой пры Святым хрышчэнні далі імя **Гальшка**. Яна не дажыўшы поўнага году памерла, пахавалі мы яе ў койданаўскім зборы ў 1631 годзе 10 жніўня.

У 1632 годзе абралі мяне дэпутатам з Браслаўскага павету з братам маім Яго міласцю панам **Юрыям Масальскім** на суды Галоўныя Трыбунальскія, якія паводле права засеўшы і выканаўшы прысягу, судзілі два тыдні. Аднак, з кола нас рушыла смерць Караля Пана нашага **Жыгімонта III**, які памёр у 1632 годзе 29 красавіка. У тым жа 1632 годзе 8 мая выехаў я з Вільні з місіяй набору ў войска, якую на мяне князь Яго міласць пан гетман [Радзівіл] наклаў, даўшы мне адпаведны ліст на 100 коней гусарыі, і збору іх у Менску. Таго ж 1632 году 24 чэрвеня нарадзіўся мне сын. Далі яму імя пры Святым хрышчэнні – **Ян**. Таго ж 1632 году 7 ліпеня Яго міласць пан **Леў Сапега**, ваявода Віленскі, гетман вялікі літоўскі памёр у Ражанай і пахаваны ў Бярозе 21 ліпеня 1632 [г.].

У 1633 годзе ў сакавіку ў абозе пад Красным даў мне князь Яго міласць [Радзівіл] адпаведны ліст ад Караля Яго Міласці на 120 коней гусарыі і таго ж месяца выехаў я з абозу для суплементу да той маёй харугвы.

У 1638 годзе 10 лютага нарадзілася мне дачушка. Пры Святым хрышчэнні далі ёй імя **Соф'я Палонія**. Кумамі [былі] пан **Самуэль Юндзіл** і пан **Карманоўскі**, кумы – пані **Галяеўская**, пані **Каменьская** і дачушка наша панна Рэгіна.

У 1639 годзе 18 жніўня нарадзілася нам дзяўчына, якой пры Святым хрышчэнні далі імя **Барбара** (памерла 25 красавіка 1715 года).

У 1640 годзе 15 ліпеня ў Вільні зламаў я нагу. Таго ж 1640 года 19 верасня ў прытомнасці князь Яго Міласць пан Крыштаф Радзівіл, ваявода Віленскі, дабрадзей мой, зышоў з гэтага свету. Таго ж 1640 года 16 кастрычніка ў Бранчыцах малжонку маю з бярэмя Пан Бог вызваліў і даў нам дачку. Далі ёй імя пры Святым хрышчэнні **Гэлена**. Яна колькі месяцаў жывучы, Пану Богу душу аддала.

У 1641 годзе 5 лістапада развязаў Пан Бог малжонку маю і даў нам дачушку. Далі ёй імя пры Святым хрышчэнні **Леанора Крыстына**.

*Аляксей Шаланда, Іна Крайнева*

**Літаратура і крыніцы:**


1. ГДГАМ, КП № 29053/07726.
2. Laucevicius E. Popierius Lietuvoje. Atlasas.– Vilnius, 1967.– 577 s.
3. Лауцявичюс Э. Бумага в Литве в XV–XVIII веках.– Вильнюс, 1979.– 187 с.
4. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. давед.– Мн.: БелЭн, 1995.– 671 с.
5. PSB.– Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk, 1976.– (Milewski I.–Młodowska J.).– 416 s.
6. ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1999.– Т.5.– 592 с.


## Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня (працяг).




У Гарадзенскім Бернардынскім касцёле, увайшоўшы, па праваму боку можна бачыць на сцяне каменную пліту з такім надпісам: *"D[eo] O[ptimo] M[aximo]/ ANDRZEY.Y ANNA / Z POŁVBINS[K]ICH / NA. KŁANINIE. KŁANICCY / STAROSTOWIE. GNIEZDZIEWSCY / MAŁZQKOWIE / PROSZA. O TROIE. POZDRO / WIENIE. ANIELSKIE / WYSTAWIONY. PRZEZ. IOZEFATA / MICHAŁA. Y KONSTANCYQ. Z IVNDZ / IŁOW. NA KŁANINIE. KŁANICKICH / CHOROZYCH. WOI.WODZTWA. PO / MORSKIEGO./ MAŁZQKOW / R[OKU]. 1.7.6.8" ("Божа Найлепшы Найвысшы. Андрэй і Ганна з Палубінскіх на Кланіне Кланіцкія, Гнездзеўскія старосты, малжонкі, просяць аб трайным анёльскім паздраўленні. Выстаўлены Язафатам Міхалам і Канстанцыяй з Юндзілаў на Кланіне Кланіцкіх, харужых Паморскага ваяводства, малжонкаў, [у] 1768 годзе")*. У ніжніх вуглах пліты, каля надпісу, выбіты два гербы: справа – на круглай картушовай тарчы падкова канцамі ўніз, на якую пакладзены злучаныя накрыж страла вастрыём уверх з раздзёртым канцом і доўгі крыж верхам улева, над тарчай стылізацыя пад графскую карону з сям'ю пэрлінамі (зменены герб "Нязгода"), злева – на круглай картушовай тарчы лебедзь, над тарчай стылізацыя пад княжацкую мітру [гл.фота]. Гербы належалі Юзафату

Міхалу на Кланіне Кланіцкаму, харужаму Паморскага ваяводства (першы) і яго жонцы Канстанцыі з Юндзілаў (другі) [1, Т.5.– S.120; Т.6.– S.567–568].

Кланін размешчаны ў Вейгероўскім павеце Пруской зямлі пры Жарноўска-Гданьскім тракце. У 1766 г. ім валодалі лейтэнант Адольф Устарбоўскі і нейкі Яноўскі [2, s.174]. Відаць, Кланіцкія страцілі правы на свой родавы маёнтак або валодалі нязначнай яго часткай. Як вынікае з надпісу на пліце, у сярэдзіне XVIII ст., дзякуючы шлюбам, Кланіцкія перасяляюцца ў Гарадзенскі павет ВКЛ.

*Сяргей Амелька (фота аўтара)*

**Літаратура:**


1. Niesiecki K. Herbarz Polski.– Lipsk, 1840.– T.5.– 476 s.; – 1841.– T.6.– 588 s.
2. Słownik geograficzny królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich.– Warszawa, 1883.– T.4.– 963 s.


## ***РЭЦЭНЗІІ***

### Зьміцер Дзядзенка

*Аршанская шляхта.*
Менск, 1996.– 64 с.

З'яўленне кожнай кнігі па гісторыі, генеалогіі ці геральдыцы шляхецкіх родаў Беларусі заўсёды адметная падзея ў нашай гістарыяграфіі, беднай на падобныя выданні. Асабліва, калі гэта датычыць шляхты ўсходніх зямель Беларусі, лёс якой у канцы XVIII–XIX ст. складваўся па рознаму. Адныя з іх атрымалі расійскае дваранства, другія так і засталіся асобамі другога гатунку, другой эпохі і дзяржавы, якая мінула.

Першым, хто распачаў працу ў даследаванні шляхты менавіта Аршанскага павету, быў Зміцер Даўгяла. Ён апісаў роды аршанскай шляхты ў працы пад назвай *"Аршанскі гербоўнік"*.[71] Даследаванне Зм.Дзядзенкі з'яўляецца пэўным працягам згаданай працы. Аўтар сістэматызаваў і ўвёў у навуковы абарот шэраг новых крыніц і даследаванняў, дапоўніў спісы аршанскай шляхты новымі родамі. Разам з тым, карысным, на наш погляд, было б выкарыстаць для гэтага шрыфтавое вылучэнне, як і спасылкі на атрыманую з крыніцаў інфармацыю. Недахопам з'яўляецца таксама тое, што вялікая колькасць родаў аршанскай шляхты падаецца без указання іх гербаў. У выглядзе дадатку пададзены тлумачэнні службовых пасад, скароты і пазначэнні.

*Сяргей Амелька*

### Мікола Гайба

*Могілкі і пахаванні ў Навагрудку: Краязнаўчы нарыс.*
Мн.: Пейто, 2000.– 40 с.



Толькі ў №1 "ГL" [с.46–47] мы адзначылі, што ў Кракаве выйшла праца Я.Розмуса і Ю.Гардзеева аб фарных могілках у Горадні (1999), і вось новае выданне наваградскага краязнаўцы М.Гайбы папоўніла спіс даследаванняў падобнага кшталту. Аўтар зрабіў спробу акрэсліць у агульных рысах гісторыю Наваградскіх могілак. Час з'яўлення першых пахаванняў, якія адносяцца непасрэдна да Наваградка, сягае канца X ст., калі на ўзгорку, што называецца Малы Замак узнікла першае пасяленне. Да канца XI ст. Наваградак (а нават і пазней) быў пераважна язычніцкім горадам і месцам пахавання яго жыхароў быў курганны могільнік, размешчаны каля цяперашняй вёскі Брацянка. Археолагамі на Малым Замку былі

[71] ИЮМ./ Под ред. Д.И.Довгялло.– Витебск, 1900.– Вып.28.– Ч.1.– 356 с.; Ч.2.– 159 с. (Оршанский гербовник).

выяўлены 3 магілы пачатку XII ст., што сведчыць аб пераходзе ад пахаванняў у курганах да грунтовых магілаў. Былі гэта ўжо хрысціянскія пахаванні.

Большая частка працы М.Гайбы прысвечана Старым хрысціянскім могілкам у Наваградку. Ім разгледжаны іх размяшчэнне і планіроўка, прааналізаваны час узнікнення і дадзена апісанне выгляду асобных помнікаў, капліцаў, надмагільных надпісаў і эпітафіяў, крыжоў. Аўтар склаў таксама карты-схемы наваградскіх могілак і падаў кароткія біяграфіі некаторых пахаваных там людзей. На нашу думку, гэтая частка кнігі можа быць значна дапоўнена, асабліва інфармацыяй аб пахаваннях славутых шляхецкіх родаў Наваградчыны.

На жаль, аўтар вельмі сцісла паведамляе аб жыдоўскіх і татарскіх могілках у Наваградку. На першых, паводле М.Гайбы, захавалася каля 700 помнікаў, а на другіх – 1800 (!) (с.16–17). Хочацца спадзявацца, што праца па іх апісанню яшчэ наперадзе, тым больш, што час да іх нелітасцівы і прымушае спяшацца.

Трэба адзначыць, таксама, што ў адносінах да часу заснавання новых хрысціянскіх могілак існаваў загад Расійскага ўрада ад 1796 г., які прадпісваў: *“...каб могілкі пры касцёлах былі заменены, а новыя закладаліся далёка ад размяшчэння жыхароў...”*[72]. У сувязі з гэтым, нават пры адсутнасці на плане гораду 1797 г. новых могілак, яны ўсё ж павінны былі з’явіцца менавіта ў гэты час, а не ў пачатку XIX ст. (с.18).

Кніга М.Гайбы – першая ў Беларусі спроба апісання могілак, якую трэба толькі вітаць. Спадзяемся, што яна прыцягне ўвагу да гэтай нашай спадчыны іншых краязнаўцаў і аматараў гісторыі і навуковая праца ў гэтым накірунку знойдзе свой працяг.

*Сяргей Амелька*

## Edmundas Rimśa

*Lietuvos Didžiosios Kunigaikśtystes miestu antspaudai.*
Vilnius: Żara, 1999.– 764[4] s., il.

У 1999 г. у віленскім выдавецтве *“Żara”* выйшла манаграфія Эдмундаса Рымшы *“Пячаткі гарадоў Вялікага княства Літоўскага”*. Першае, што ўражвае – гэта вялізны аб’ём кнігі. Каля 765 старонак. Паліграфія выдання бездакорная, шматлікія ілюстрацыі сфрагістычнага матэрыялу вельмі якасныя.

Як заўважае сам аўтар, кніга пісалася не адзін дзесятак гадоў. Манаграфія распавядае пра пячаткі гарадскіх асяродкаў краіны да Люблінскай уніі. Таму ў ёй пададзены матэрыял пра сфрагістыку ўсіх тагачасных гарадоў, якія на дадзены момант знаходзяцца ў складзе пяці дзяржаў: Літвы, Беларусі, Польшчы, Украіны і Расіі.

Кніга складаецца з двух частак. Першая глава пачынаецца экскурсам у гісторыю сфрагістыкі антычных часоў і сярэднявечча. Аўтар падкрэслівае, што з’яўленне пячатак гарадоў ВКЛ трэба звязваць з часам атрымання гарадскога самакіравання. Пячатка надавалася манархамі. Пячатку мелі рада і лава, войт, мяшчане.

Цікавым падаецца расповяд пра гісторыю пячатных штэмпеляў, якія выраблялія злотнікамі. Аўтар знайшоў 19 арыгінальных і 4 копіі гэтых інструментаў, якімі ставіліся пячаткі. Зробленымі штэмпелямі карысталіся стагоддзямі. Каля 200 год імі карысталіся ў канцылярыях Горадні, Нясвіжу і Віцебску, а за іх стан захавання адказвалі бурмістры.

Э.Рымша правёў надзвычай дэталёвы аналіз формаў пячатак, матэрыялу, з якога яны выраблялся – воску, яго колераў. У сваім даследаванні аўтар не абмяжаваўся прадстаўленнем сфрагістычнага аспекту, але заглыбіўся да метадаў апячатвання дакументаў: завешвання і адціскавання пячаткі, якой зацвярджаліся дакументы ў магістрацкіх актавых кнігах. Спецыяльнае месца прысвечана эпіграфічнаму аспекту праблематыкі: легендам і мове. Як вынікае з кнігі, легенда выконвалася на трох мовах: на латыні, па-старабеларуску і па-польску.

[72] Дакумент у архіве рэцэнзента.

Другая глава з'яўляецца падарожжам у геаграфію сфрагістычных помнікаў далюблінскага, на той час сапраўды Вялікага, княства Літоўскага. У ёй аўтар распавёў пра 468 пячатак 123 гарадоў, з якіх захаваліся 429 пячатак з 114 асяродкаў.

Надзвычай цікавым падаецца агляд бібліяграфічных пазіцый, у якім можна сустрэць кнігі, напісаныя па гарадской праблематыцы ў XIX ст., польскімі аўтарамі міжваеннага дваццаціголдзя, а таксама беларускімі даследчыкамі. Але найістотнейшым падаецца выкарыстанне аўтарам шматлікіх архіўных матэрыялаў Вільні, Менску, Берліну, Торуні, Гданьску, Варшавы і Курніку.

У канцы кнігі змешчаны грунтоўныя рэзюмэ. Праўда, у яго польскай версіі можна заўважыць адну невялікую недарэчнасць (s.707). Перакладчыца тэксту называе гарадзенскага *"бурмістра рускага"* XVI ст. *"Rosjaninem"* (?!). Сярод жыхароў беларускіх ці літоўскіх гарадоў тых часоў знайсці выхадцаў з Вялікага княства Маскоўскага было надзвычай цяжка. Праўда, пасля шэрагу жорсткіх войнаў з усходнім суседам у шматлікіх гарадах ВКЛ пасяляліся невялікія групы палонных жыхароў Масковіі. Таму цяжка сабе ўявіць, каб асоба, якая пасля "вызваленчага паходу" трапіла ў вязніцу, магла так хутка ўзначаліць гарадскую раду! Урэшце, жыхары Вялікага княства Маскоўскага ў тагачасных дакументах называліся *"Маскавітамі"*, а не *"рускімі"*.

*Юры Гардзееў*

## ***ПЫТАННІ, АДКАЗЫ, КАНТАКТЫ, ІНФАРМАЦЫЯ***

### *Пытанне № 2*



Грыгоры Аляксандравіч Хадкевіч, падкаморы ВКЛ (1544–1559), Віцебскі (1554) і Кіеўскі (1555) ваявода, каштэлян Троцкі (1559), гетман польны (1561), каштэлян Віленскі (1564), і, нарэшце, гетман вялікі ВКЛ (1566), быў адным з самых уплывовых магнатаў Беларусі. У заснаванай ім Заблудаўскай друкарні славуты Іван Фёдараў у 1569 г. выдаў *"Евангелле вучыцельнае"*. На адвароце тытульнай старонкі кнігі змешчана вядомая геральдычная гравюра з асабістым гербам Г.А.Хадкевіча, які мы падаем побач. Наколькі нам вядома, пакуль ніхто з даследчыкаў, што займаліся вывучэннем аздаблення кніг заблудаўскай друкарні, так і не адказаў на пытанне: "Што значаць і каму належалі гербы, злучаныя ў чатырох частках складанага гербу Г.Хадкевіча?" Паспрабаваў гэта зрабіць украінскі гісторык Я.Ісаевіч, але не зусім удала. Вось як ён іх тлумачыць: *"На чатырох палях гербавага шчыта намаляваны гербы гетмана [Г.А.Хадкевіча] і яго продкаў, у тым ліку бацькоўскі герб "Касцеша" і мацярынскі "Праўдзіч", а таксама герб Вялікага княства Літоўскага ("Пагоня"), які служыў і гербам Гедымінавічаў князёў Бельскіх, з якіх паходзіла маці гетманавага бацькі".*[73] Сапраўды, у першым полі змешчаны родавы герб Хадкевічаў "Барэйка", які пазней стаў атаясамляцца з польскай "Касцешай"[74], а ў трэцім – "Пагоня" бабкі па бацьку княжны Агнешкі Бельскай.[75] Пра герб у другім полі Я.Ісаевіч гаворыць, што гэта мацярынскі "Праўдзіч". Аднак, па-першае, польскі герб "Праўдзіч" выглядаў трошкі інакш: *"...у полі блакітным чырвоны мур з зубцамі, з-за якога ўзнімаецца палова залатога льва з залатой праўдай [колам] у лапах..."* [76], а па-другое, маці Г.А.Хадкевіча

---

[73] Ісаевіч Я.Д. Рыгор Хадкевіч як выдавец і аўтар прадмоў.// Спадчына Скарыны: Зб.мат-лаў першых Скарынінскіх чытанняў (1986)./ Уклад.А.І.Мальдзіс.– Мн.: Навука і тэхніка, 1989.– С.209.

[74] Шаланда А. Да пытання паходжання гербу Хадкевічаў.// Białoruskie zeszyty historyczne.– Białystok, 1995.– Nr 1/3.– S.5–10.

[75] Dworzaczek W. Genealogia. Tablice.– Warszawa, 1959.– Tabl. Nr 166.

[76] Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1992.– S.127.

была княжна Васіліса Яраславічоўна[77], якая карысталася таксама гербам "Пагоня", пра што сведчыць яе пахавальная труна.[78] Не мог гэта быць і герб жонкі Г.А.Хадкевіча, бо ёй была княжна Кацярына Вішнявецкая гербу "Карыбут".[79] Што датычыць апошняга гербу ў чацьвёртым полі: кроква з трыма яблыкамі, то яго Я.Ісаевіч увогуле ніяк не патлумачыў. Такім чынам, каму належалі гербы ў другім і чацьвёртым полі са складанага гербу Г.А.Хадкевіча?

*Рэдакцыя*

## *Канферэнцыі*



На фота: удзельнікі навукова-краязнаўчай канферэнцыі, г. Шчучын., кастрычнік 2000 г.

27 кастрычніка 2000 г. ў Шчучыне адбылася навукова-краязнаўчая канферэнцыя *"Шчучын польскі і Шчучын Лідскі на Беларусі"*. Незвыклая яе назва выклікана тым, што арганізатары – Шчучынская філія Саюзу палякаў на Беларусі, на жаль, ніяк не могуць прывыкнуць да таго, што ёсць *"Шчучын беларускі"*. Спатканне адбывалася ў будынку шчучынскага Дому палякаў. Удзел у канферэнцыі прынялі пераважна польскія гісторыкі. Адкрыў яе прафесар Міхал Гнатоўскі з Беластоку. Пасля былі зачытаны рэфераты па пытаннях мясцовага кіравання і гістарычнага мінулага дзвух гарадоў. Выступілі: Станіслаў Вандалоўскі, мэр польскага Шчучына (*"Грамадска-гаспадарчае развіццё Шчучына ў Польшчы"*), мясцовы краязнавец Вацлаў Дзежыц (*"Палякі на Шчучынскай зямлі"*) і інш. Пані доктар Ірэна Грахоўская прадставіла сваю манаграфію і рэферат на тэму: *"Падканцлер ВКЛ Станіслаў Антоні Шчука – заснавальнік Шчучына ў Віскай зямлі"*. З вялікім і грунтоўным дакладам выступіў выкладчык Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат культуралогіі Сяргей Данскіх. Ён распавёў пра заснаванне і лёс беларускага Шчучына, прасачыў ролю і значэнне ў яго развіцці прадстаўнікоў такіх родаў як дэль Кампа Сцыпіёны і князі Друцкія-Любецкія. Рабочымі мовамі канферэнцыі былі польская і, па жаданню арганізатараў, …расійская (!?). Канферэнцыя скончылася экскурсіяй па гораду і канцэртам, наладжаным самадзейнымі артыстамі.

*Сяргей Амелька*
*(фота аўтара)*

* * *

7–9 чэрвеня 2001 г. у Мельніку на Падляшшы (Польшча) адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя: *"Вялікае княства Літоўскае і этнагенез Беларусаў"*, наладжаная Беларускім Гістарычным Таварыствам у Польшчы і прысвечаная 500-годдзю Мельніцкай уніі 1501 г. і наданню Мельніку правоў горада. У ёй удзельнічалі гісторыкі Польшчы, Беларусі і Літвы. С польскага боку на канферэнцыі выступілі: др.Ян Тэнгоўскі (Торунь) з паведамленнем *"Крэўская унія"*, Яраслаў Нікодэм (Познань) – *"Прычыны забойства Жыгімонта Кейстутавіча"*, др.Тадэвуш Васілеўскі – *"Удзел праваслаўных у кіраўнічым апараце ВКЛ"*, Тамаш Кэмпа – *"Руская магнатэрыя і Люблінская унія"*,

[77] Dworzaczek W. Genealogia…– Tabl. Nr 166.
[78] Maroszek J. Prawa i przywileje miasta i dobr ziemskich Zabłudów XV–XVIII w.– Białystok, 1994.– S.183.
[79] Dworzaczek W. Genealogia…– Tabl. Nr 166.

Дарота Міхалюк – *“Аб магчымасцях даследаванняў над этнічнай структурай насельніцтва Падляшша ў XVI ст.”* і інш. Прадстаўнічай была беларуская дэлегацыя. Др.Г.Галенчанка (Менск) прадставіў даклад на тэму *“Народ “рускі” у гістарычных крыніцах ВКЛ XVI ст.”*, др.Аляксандр Краўцэвіч (Горадня) – *“ВКЛ. Узаемаадносіны этнасу і дзяржавы”*. З паведамленнямі выступілі таксама Генадзь і Альбіна Семянчукі (Горадня), Юры Гардзееў (Горадня–Кракаў), Васіль Варонін і Андрэй Радаман (абодва – Менск) і інш. Літоўскі бок прадстаўлялі Рыта Трымонене (Шаўлі) – *“Ягелонская палітыка і фармаванне літоўскага народу палітычнага ў канцы XV–першай палове XVI ст.”* і Генютэ Кіркене (Вільня) – *“Пачаткі роду Хадкевічаў”*.

Дзякуючы рэгламенту, калі абмеркаванне дакладаў адбывалася адразу пасля выступленняў, былі сур’езна абмеркаваны найбольш цікавыя і спрэчныя праблемы гісторыі ВКЛ і этнагенезу беларусаў. Мы ж асобна вылучым даклад аб пачатковым радаводзе Хадкевічаў, бо ён мае прамое дачыненне да нашага *“Пытання № 2”*. Спадарыня Г.Кіркене, на падставе аналізу як вядомых, так і новых матэрыялаў, прыйшла да высновы, што род Хадкевічаў паходзіў не з Кіеўскай зямлі, як гэта зараз прынята, а з Гарадзенскага павету. Магчыма, гэтая інфармацыя дапаможа вырашыць пастаўленую намі праблему.

*Аляксей Шаланда, удзельнік канферэнцыі*

**Спіс скаротаў:**

АЮЗР – Акты, относящиеся к истории Юго-Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею.
ВИД – Вспомогательные исторические дисциплины.
Вып. – Выпуск.
ЯКМ – Яго Каралеўская Міласць.
AGAD – Archiwum Główne Akt Dawnych.
AW – Atheneum Wileńskie.
BZH – Białoruskie Zeszyty Historyczne.
LSP – Lituano-Slavica Posnaniensia.
MH – Miesięcznik Heraldyczny.
PSB – Polski Słownik Biograficzny.
R. – Rocznik.
Ryc. – Rycina.
SŻ – Studia Żródłoznawcze.
Sygn. – Sygnatura.
Tabl. – Tablica.
WNA – Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne.

**Увага!** Звяртаем увагу нашых Чытачоў на тое, што змяніўся электронны адрас “ГL” на: **E-mail: Litherland@tut.by**

KAMUNIKAT.org